Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

СТУДЗЕНЬ 5
1933 г.
№ 4 (4548)
Год выданьня XVI

Инв. 2669

Пралетары ўсіх краін, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — На парозе гіганцкіх клясавых баёў. Л. МАД'ЯР — Даўгавы вузел імпэрыялістычных супярэчнасьцяй (3 стар.).

АГЛЯД ДРУКУ — Калышанцы (2 стар.).

Аб мерапрыємствах супроць найбольш адстаючых раёнаў — Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б (1 стар.).

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ: Міжуцкі — Патрэбны не словы, а лён... (2 стар.). А.—Кулацкіх шкодніцтваў да адказнасьці (1 стар.).

Кулацкае супраціўленьне ў ільнаводчых раёнах яшчэ не зломлена (1 стар.).

Ачысьціць нізавы савецкі і загатоўчы апарат ад кулацкіх лавутчыкаў (2 стар.).

Тэхмінімум—конкрэтну рабочаму (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Гераічная барацьба рабочых Беларускай Пушчы (4 стар.).

Захват шанхай-Гуаня — першы крок да захопу правінцыі Жэхэ (4 стар.).

ПАЗШ будуюць магутны паветраны флёт (4 стар.).

НА ПАРОЗЕ ГІГАНЦКІХ КЛЯСАВЫХ БАЁЎ

Мы сустрэлі 1933 год сусьветна-гістарычнай перамогай — завяршэньнем першай бальшавіцкай пяцігодкі!

Ну, а «яны»?

«Мэтвы звотой. Усюды шэра, імглета, безнадзейна...», — так ацэньвае новагоднія пэрспэктывы фашысцкай Польшчы ультра-рэакцыйны «Дзеньнік віленскі».

Гэта — агульнае прызнаньне сусьветнай буржуазнай прэсы. «Бэрлінэр тагеблат» у суполі з новым годам ее страхам і трывогай зазуляе, што «мы бясьсільны змагацца з парманэтным беспрацоўем». Орган германскіх прамысловых магнатаў «Бэрэн цэйтунг» з нямецкай рэшчэчу крычыць, што «... увесь сьвет трашчыць па швох». Рупар цьвёрдалобых «Морнінг пост» правіцца сьпёзы над тым, што новы год нясе «... перамагаючую цэмру»...

Сусьветны эканамічны крызіс, які ўзьнік і РАЗРАСТАЕЦЦА з усё больш катастрафічнай сілай на аснове ўсеагульнага крызісу капіталізму, ушчэнт разбурыў пягенду буржуазнай прэсы аб «паляпшэньні гаспадарчай кан'юнктуры». Змяўкла аптымістычная прапавесь, «бліскага скажэньня крызісу». Прыкусілі язык, кібы пабітыя сабакі, буржуазныя эканамісты, якія з такім запалам, з такой радасьцю прадказалі «новы росквіт». Куды топкі зьнікні ружовыя настрої «Форэзэртсэ», «Роботнік» і іншых лейб-органаў сацыял-фашызму, якія ўсяго яшчэ 6 месяцаў назад білі ва ўсе званы аб «новым кан'юнктурным паваротце». Як пасьмяротна, якой трывогай перад нарастаючай новай крызісу і разьвалу гучаць сёньня іх новагоднія прызнаньні!

1932 год быў годам ДАЛЕЙШАГА БЯЗУПЫННАГА АБВАСТРЭНЬНЯ сусьветнага эканамічнага крызісу. Ужо ў жніўні мінулага году індэкс прамысловай прадукцыі ўсіх капіталістычных краін складаў толькі 67 параўнальна з 1928 годам, узятым за 100. У такіх дзяржавах, як Амэрыка, Францыя, Германія і Англія, гэты індэкс яшчэ БОЛЬШ НІЗКІ: па Германіі — 51,8, ПАЗШ — 54,1 і г. д. Вытворчасьць стаці, чыгуну і машын скарацілася на 40—75 проц. Дзякоі ўказаць, што топкі адзін выпуск чыгуну за мінулы год зьменшыўся больш чым на 40 проц. параўнальна з 1931 г.

Гіганцка вырасла беспрацоўе, якое пагыбяляе з кожным новым днём. 50.000.000 беспрацоўных, 50.000.000 людзей, выкінутых буржуазіяй на вулицу, 50.000.000 галадаючых, асуджаных на пасольнае вымираньне — што можа больш пераканаўча, больш яркі сьведчыць аб ганебным і бесперавотным банкруцтве цяперашняй нізкі пра «новы росквіт»?

Новат афіцыёзная «Газэта польска» прымушана прызнаць, што «1932 год будзе запісан у гісторыю сусьветнай гаспадаркі, як асабліва цяжкі год». А наперадзе — «перамагаючая цэмра», а наперадзе — «мётвы зостой»...

Сусьветная буржуазія дасканала разумее, што чацьвертая зіма крызісу пагражае магутнымі рэвалюцыйнымі бурамі.

Капіталізм у сьмяртальнай трывозе. Усе сілы рэакцыі кіданы на тое, каб папярэдзіць выбух клясавага гневу мас, якія пераходзяць на шлях актыўнай рэвалюцыйнай барацьбы пад лёзунгамі Камінтэрну супроць буржуазіі і яе агентаў.

Не дапусьціць рэвалюцыйнага выбуху і прайсьці праз чацьвертую крызісную зіму без сацыяльных патрасэньняў, папярэдзіць, як адзначыла піша буржуазная «Франкфуртэр цэйтунг», «палітычную рэвалюцыю», — такавы замысны буржуазіі.

Усё гэта толькі можа, капіталізм кідае на

Даўгавы вузел імпэрыялістычных супярэчнасьцяй

Не падлягае найменшаму сумненьню, што адмаўленьне ПАЗШ адтэрміноваць сьнежаньскія плацяжы па ваенных даўгох паставіла Англію і Францыю ў фінансавых адносінах у вельмі цяжкое становішча. Сьнежаньскі ўзнос, які Англія павінна была зрабіць Злучаным Штатам, складае 93 млн. даляраў. Аднак, у той-жа час ангельскаму казначэйству прыходзіцца заплаціць каля 80 млн. даляраў за выкуп тых дзяржаўных аблігацый, замежныя ўласьнікі якіх не згадзіліся на канвэрсію па найбольш нізкім пропанце. Ангельскае казначэйства, такім чынам, стаіць перад задачай перавесьці каля 173 млн. даляраў за граніцу.

Акрамя таго, прадстаіць яшчэ плацяжы па даўгох, заключаных па стабілізацыі фунта стэрлінгаў у 1931 г. Гэтыя моманты даюць тлумачэньне рэзкага зьніжэньня курсу фунта стэрлінгаў. Гэтымі-ж моментамі тлумачыцца і тое, што ў лягеры ангельскай фінансавай алігархіі разгарэлася вастрэйшая барацьба на пытаньні аб тым, плаціць ці не. Унясеньне сьнежаньскіх плацяжоў азначае далейшае абясцэненьне фунта стэрлінгаў.

Але ці можа Англія, якая займае ўсё яшчэ другое месца на сусьветным гандлёвым рынку, а ў галіне фінансаваньня замежнага гандлю, суднаходзтва, страхаваньня першае месца, абвясьціць сябе неплатаздольнай? Ці можа Англія, якая мае замежныя капіталаўкладаньні ў памеры 4 млрд. фунтаў стэрлінгаў, значыць каля 40 млрд. рублёў золатам, абвясьціць сябе неплатаздольнай і тым самым нанесьці небясьпечны прыклад сваім уласным даўжнікам? Ці можа ангельскі ўрад, які мае ўнутраную запазычанасьць у памеры 7,4 млрд., абвясьціць сябе неплатаздольным і тым самым нанесьці непаправны ўдар усёй сусьветнай крэдытнай сыстэме — прыпыніць сьвятасьці дагавораў?

З другога боку, бясспрэчна, што ўнясеньне плацяжоў па ваенных даўгох надавычай абвастрае і без таго крытычнае становішча ангельскага бюджэту.

Вось чаму ангельскі ўрад так упарта змагаўся за адтэрмінованьне плацяжоў. Але іменна таму ўрад ПАЗШ адхіліў усе ангельскія ноты, усе ангельскія аговоркі. Некаторыя думалі, што міжнародныя банкіры ў ПАЗШ запікаўлены ў ануляваньні ваенных даўгоў і будуць аказваць націск на Гувэра ў гэтым сэнсе для таго, каб забясьпечыць плацяжы па прыватных і замежных даўгох. Справа аднак, у тым, што праблема даўгоў даўно перастала быць эканамічнай праблемай, **што яна ўвязана з пытаньнем аб Манчжурыі, аб узбраеньнях, аб размеркаваньні золата, аб перадачы рынкаў, калёній і г. д.** Іменна таму ангельскі ўрад скарыстаў пытаньне аб даўгох для ўзмацненьня англа-французкага супрацоўніцтва. Адхіляючы і разьбіваючы ўсе спробы ПАЗШ разьяднаць Англію і Францыю, Лёндан дэманстраваў адзіны фронт паміж Англіяй і Францыяй. А ПАЗШ якраз дабіваліся расколу англа-французкага блёку.

Для Францыі праблема ваенных даўгоў, з пункту гледжаньня фінансавага, прадстаўляе меншыя труднасьці. Францыя, маючы вялікія залатыя запасы магла-б вывезьці 19 млн. даляраў, якія яна павінна аплаціць Злучаным Штатам. Аднак, французкі імпэрыялізм да гэтага часу абараняў той пункт гледжаньня, што Францыя будзе плаціць па міжсаюзьніцкіх ваенных даўгох толькі ў тым выпадку, калі яна атрымае рэпарацыі ад Германіі. Германія ня плаціць рэпарацый. Любы французкі ўрад, які-б спрабаваў унесьці плацяжы па ваенных даўгох, пе атрымліваючы рэпарацыйных даўгоў ад Германіі, рызыкаваў-бы правалам у французкім парляманце. Французкая палата дэпутатаў у цяперашнім сваім складзе наўрад ці згадзілася-б на такі крок.

Уся праблема ваенных даўгоў ускладняецца яшчэ тым, што Бэльгія і Польшча адмовіліся плаціць, лічачы за лепшае абвяшчэньне адкрытага банкрутства.

Праблема ваенных даўгоў складае частку ўсёй эрсальскай сыстэмы. У рэзультаце вайны паміж эўрапэйскімі краінамі цэлая піраміда даўгавых абавязацельстваў, а на вярху яе сядзіць Злучаныя Штаты, якім заваёўваліся ў часе сусьветнай вайны ўсе эўрапэйскія дзяржавы. Базісам усёй гэтай сыстэмы міжнародных даўгавых абавязацельстваў служыў германскія рэпарацыйныя плацяжы. Ход сусьветнага эканамічнага крызісу і выбухнуўшы ўлетку 1931 году крадучы крызіс разбурылі гэты базіс.

З прычыны зьмяншэньня даходаў у рэзультаце крызісу па заграничных капіталаўкладаньнях, скарачэньня сусьветнага гандлю ўвесь будынак міжнародных плацяжных абавязацельстваў атрымаў моцны ўдар. **Амаль усе краіны Паўднёвай і Цэнтральнай Амэрыкі зьяўляюцца ўжо банкрутамі. Амаль усе балканскія краіны ўжо спынілі плацяжы па сваіх міжнародных даўгох, а ў Цэнтральнай Эўропе — Германія, Вэнгрыя,**

10-ці га—«недарод» на 100 проц., на астатніх—на 65 проц.

тох ў лінеі Го... не пераараўстановішча рэчаў, адтэрміноўваў супярэчнасьцяй вакол пытаньня аб ваенных даўгох і рэпарацыях.

Але ўсё разьвіцьцё міжнародных адносін на працягу апошняга году ўнесла столькі абвастрэньня, столькі ўскладненьняў ва ўзаемаадносіны імпэрыялістычных дзяржаў, што праблема ваенных даўгоў стала ў даны момант толькі фокусам, у якім адбіваюцца ўсе супярэчнасьці імпэрыялістаў. **Вакол гэтага пытаньня стварыўся вузел супярэчнасьцяй, які зацягваецца ўсё тужэй і тужэй.** Гутарка ідзе ня толькі аб эканамічнай, але і аб глыбока-палітычнай праблеме.

Супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Англіяй зьяўляюцца вядучымі супярэчнасьцямі ў лягеры імпэрыялістаў. Яны, гэтыя супярэчнасьці, пранізваюць усе астатнія міжімпэрыялістычныя супярэчнасьці і накладаюць на іх свой адбітак. У найбольш яўнай форме гэтыя супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Англіяй праявіліся за мінулы год на наступных пытаньнях:

1. У Паўднёвай Амэрыцы жорсткая барацьба паміж ангельскім і амэрыканскім імпэрыялізмам вылілася ў цэлы рад дзяржаўных пераваротаў у розных краінах Паўднёвай і Цэнтральнай Амэрыкі. **Ангельскі імпэрыялізм прабаваў зьвергнуць у гэтых краінах урады, якія арыентаваліся на ПАЗШ, а амэрыканскі імпэрыялізм, са свайго боку, прабаваў зьвергнуць урады, якія арыентаваліся на Англію.** Вайна паміж Балівіяй і Парагваем была толькі формай праяўленьня барацьбы ня толькі паміж Стандарт Ойль і Дэтэрынгам за нафту, але і паміж ангельскім і амэрыканскім імпэрыялізмам наогул. **Вайна паміж Калумбіяй і Пэру мае той-жа сэнс зьмест.**

2. Англія дабіваецца пераразьмеркаваньня залатых запасаў і не згаджаецца, ня гледзячы на націск ПАЗШ, стабілізаваць курс фунта стэрлінгаў, пакуль Злучаныя Штаты ня згодзяцца на больш «рэгулярнае» і спра вядлівае» размеркаваньне залатых запасаў. А ПАЗШ не жадаюць паступацца сваім золатам і ў сваёй другой ноце прапануюць пераразьмеркаваньне золата ў Эўропе.

3. Ціхаакіянская праблема ўносіць вялікае абвастрэньне ў англа-амэрыканскія адносіны. Ангельскі імпэрыялізм, хаця і ў скрытай форме, патрымліваў японскі імпэрыялізм у наступленьні на Кітай і ў захопе Манчжурыі для таго, каб завяваць на свой бок Японію ў якасьці саюзьніка ў барацьбе супроць ПАЗШ. Цэлы рад выдатных капітанаў гаварыў на стойваў, што **ангельскі імпэрыялізм імкнецца да аднаўленьня англа-японскага ваенна-палітычнага саюзу**, скасаванага толькі ў 1921 г. пад націскам ПАЗШ на Вашынгтонскай канфэрэнцыі.

Пастанова тройкі аб аддачы пад суд былога старшыні сельсавету Дубры ня выканана.

Злачынна адстае і Задзежынскі сельсавет, які план ільназагатовак выканаў на 20,8 проц. Гэты сельсавет—рашаючы ільнарайон раёна. Тут сканцэнтраваны моцныя парлія, Кан... став, Бога. Што зрабіў супроць саюзу ... партыі нстар замежных спраў Саймон у часе абгаварэньня дакладу Літ... на, як адвакат японскага імпэрыялізму.

4. Новае вялікае абвастрэньне ва ўзаемаадносінах паміж Англіяй і ПАЗШ унесла Оттаўская канфэрэнцыя. Спроба ангельскага імпэрыялізму мацней зьвязаць імпэрскае адзінства, увядзеньне сыстэмы імпэрскай перавагі, якая ажыцьцяўляецца цаною вялікіх ахвяр з боку ангельскага імпэрыялізму, увядзеньне пераважных мытаў для ангельскіх тавараў у Канадзе, Аўстралі, Паўднёвай Афрыцы, Новай Зэляндыі, а таксама ў Індыі, прадастаўленьне кантынгентаў па ўвозе с.-г. тавараў у Англію брытанскім дамініёнам нанесьлі ўдар амэрыканскаму вывазу, затрудніўшы барацьбу ПАЗШ за замежныя рынкі. Вось чаму ноты ПАЗШ Англіі пазрэзьліваюць, што ўрэгуляваньне пытаньня аб даўгох залежыць ад пашырэньня рынкаў для сельскай гаспадаркі і прамысловасьці ПАЗШ.

5. Нясумненна, што праблема ўзбраеньня, пастаўленая ва ўвесь рост Жэнэўскай канфэрэнцыяй, таксама абвастрыла супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Англіяй.

Супярэчнасьці паміж Францыяй і Злучанымі Штатамі носяць іншы, менш вострый характар, чым канфлікт паміж ПАЗШ і Англіяй. Калі барацьба паміж Англіяй і ПАЗШ ёсьць барацьба паміж зьвюма буйнейшымі імпэрыялістычнымі дзяржавамі за ўладаньне сьветам, то пытаньні, вакол якіх французкія і амэрыканскія імпэрыялісты вядуць барацьбу, зьяўляюцца не настолькі ўсеагульнымі і ўсеазначэльнымі з пункту гледжаньня ўзаемаадносін імпэрыялістычных дзяржаў. Паміж Францыяй і Злучанымі Штатамі ішла і ідзе барацьба за золата, і французкія аталі на курс даляра, па заяве Гувэра, ледзь не сарвалі ўжо ўстойлівасьць даляра.

Пастаянна, што ПАЗШ супраціўляюцца імкненьню французкага імпэрыялізму да гегемоніі на эўрапэйскім кантынэнце. Паколькі ПАЗШ маюць буйнейшыя эканамічныя інтарэсы ў Германіі, яны супраціўляюцца далейшаму эканамічнаму і палітычнаму пашырэньню Германіі гегемоніі французкага імпэрыялізму. Калі французкі імпэрыялізм зьяўляецца найбольш ярым абаронцам эрсальскай сыстэмы, міжнародным яе жандарам на Захадзе, то ПАЗШ былі-б не ад таго, каб патрымаць Германію ў яе прэтэнзіях на перагляд усходніх границ, хаця ўсе гэтыя пытаньні могуць

Кулацкае супраціўленьне ў ільнаводчых раёнах яшчэ ня зломлена

У барацьбе з кулаком і пераараджэнцам мацаваць калгасны актыў!

Не аслабляць тэмпаў загатовак ільну!

Ільнаводчыя раёны не забясьпечылі выкананьня дырэктывы партыі і ўраду ў тэрмін. Толькі 6 раёнаў—Лёзьнянскі, Чашніцкі, Дрысенскі, Крупскі, Бялыніцкі і Лепельскі далі 70 проц. гадавога пляну да 1 студзеня 1933 г. Астатнія раёны, хоць і павялічылі тэмпы, усё-ж рэзка адстаюць.

Трэба падкрэсьліць, што Бялыніцкі раён, які ўвесь час быў першым, зьнізіў тэмпы і даў усяго 4,5 проц. прыросту за 7 дзён.

Узьдельная вага Мсьціслаўскага, вядучага раёну ў пляне загатовак даволі значная. Ён павінен здаць 1.400 тон валакна. Між тым, раён увесь час адстае. На 2 студзеня плян выкананы на 52,7 проц. Характэрна, што калі за апошнія дні амаль усе ільнаводчыя раёны павысілі тэмпы загатовак, дык Мсьціслаўскі раён зьнізіў іх. 8,3 проц. за 7 дзён супроць 10,9 проц. за папярэднюю пяцідзёнку лепш за ўсё гэта пацьвярджаюць.

Больш усяго за гэты час узьняў тэмпы Вушацкі раён — 33,4 проц. гадавога пляну за тыдзень.

Добрыя прыклады ў барацьбе за лён паказваюць бальшавікі Лёзьнянщчыны, якая фактычна ўжо заваяваць гадавы плян ільназагатовак і заняла першае месца па БССР.

Факты апошніх дзён сыгналізуюць аб тым, што ў некаторых мясцох не зьвяртаюць выстарчальнай увагі па якасьць валакна і трасты і прымаюць усякую прадукцыю, якую толькі прывозяць па пункты. Характэрным зьяўляецца паведамленьне з Дрысенскага раёну, дзе з прычыны нядбайных адносін да прыёмкі, сартаваньня і хаваньня трасты частка яе папсавана.

Гэты факт павінен паслужыць папярэджаньнем для ўсіх іншых ільнаводаў і прыёмачных пунктаў Загатільну БССР. Не аслабляючы тэмпаў загатовак, ні ў якім разе не забываць пра якасьць здаваемай трасты. Стандарты трасты і ільнавалакна павінны быць вядомы кожнаму калгасьніку і аднаасобніку.

БССР можа і павінна ў найкарацейшы тэрмін завяршыць гадавы плян ільназагатовак. Для гэтага ёсьць усе магчымасьці. Гэта будзе залежыць ад таго, наколькі асноўныя ільнаводчыя раёны здолеюць правільна расставіць сілы на мяльных пунктах, на пераапрацоўцы ільну.

Супраціўленьне клясава-варожых элемэнтаў павінна быць канчаткова зломлена. Усе раёны БССР павінны раўняцца па Лёзьнянщчыне, якая паказала, як троба змагацца за выкананьне дырэктывы партыі.

Валакно ніякай якасьці

СУРАЖ. (Наш кар.). Сураская кантора Загатільну мае 8 прыёмшчыкаў спэцыялістаў, двух сартоўшчыкаў па адборы ільнавалакна на экспарт, 4-х інструктароў-арганізатараў. Кантора і загатоўчыя пункты забясьпечаны таксама і рахункавым апаратам.

Ня гледзячы на наяўнасьць такога штату, прыёмка ільнавалакна і насеньня не наладжана. Ля прыёмачных пунктаў чаргі. Здатчыкам прыходзіцца цэлымі днямі чакаць прыёмкі.

Кантора Загатільну пытаньнямі перапачатковай апрацоўкі валакна як у калгасах, так і ў аднаасобным сэктары ня цікавіцца. Калгасьнікі ня ведаюць стандартаў як ільну, так і трасты. На загатоўчыя пункты паступае валакно ніякай якасьці ў сярэднім 5 і 6 нумару.

Урадам адпушчаны спэцыяльныя фонды для прэміяваньня здатчыкаў валакна — абожжа, алей і прамтавары. Кантролю за выдачай прэмій кантора Загатільну не вядзе. Гэта прывяло да таго, што нядаўна быў прэміраваны збожжем цьвёрдазаданьнік.

Ні ў адным калгасе ня выконваецца дырэктыва ўраду аб выдачы авансаў па 50 кап. на працадзень калгасьнікам, якія працуюць на ільне.

Волкаў.

„Лён пачакае"...

ШКЛОЎ. (Н...

— Нам-бы справіцца з выкананьнем збожжазагатовак, а лён пачакае, так яшчэ ня даўна заяўлялі старшыні шмат якіх сельсаветаў раёну.

І сапраўды рад сельсаветаў, як Сасьвянскі, Гарадзецкі, Гарадзішчанскі і інш., прытрымліваючыся «гарговасьці» кампаніі, з выкананьнем ільназагатовак не сьпяшаюцца.

Талкачоўскі сельсавет па выкананьні пляну загатовак ільну зьяўляецца самым адсталым у раёне—42,19 проц.—па 31-га сьнежня.

А сельсавет меў усе магчымасьці, каб сва ячасова выканаць плян. На тэрыторыі сельсавету ёсьць 2 партячэйкі. Але партячэйкі не мабілізавалі масы вакол гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі, не расставілі сваіх сіл на пасасобных вучастках.

Характэрна тое, што сам сакратар ячэйкі т. Юркевіч нават ня мае ўяўленьня аб рабоце прымацаваных да пунктаў партыйцаў.

— Я ўжо зьбіўся з толку,—кажа ён,—і ня ведаю, як хто працуе.

Толькі цяпер, калі тэрмін выкананьня пляну ільназагатовак прайшоў, Юркевіч запаўся разьмеркаваньнем сіл. Да гэтага-ж часу спалучэньня ўсіх відаў загатовак ня было.

Таму няма нічога дзіўнага, што раённы плян на 30 сьнежня выкананы на 52,5 проц.

Толькі адзін Высоцкі сельсавет ідзе ўперадзе. Плян здачы ільнавалакна ён выканаў на 91,2 проц. За пасьпяховае правядзеньне ільназагатовак сельсавет прэміраваны.

Пасасобныя зьвенні загатоўчага апарату дэтэтуль не перабудавалі сваёй работы на сваячасовае выкананьне пляну ільназагатовак. Узьмяцканьні для ссыпкі ільнянога семі як залежыць не падрыхтаваны.

Па-ранейшаму загатільну ў Шклове па прыёмцы ільнянога семі працуе толькі адзін чалавек. Па-ранейшаму ўскладзены абавязкі ўзважваньня і прыёмкі ільнянога семі, а таксама выпіска талёнаў для атрыманьня грошай.

Гэты прыёмшчык працуе вельмі марудна. «Нуды стаміцца, у шыю мяне ніхто ня гоніць»,—кажа ён.

Гэта стварае вялізарную чаргу здатчыкаў ільну. Падыходзіць 5-6 гадзін вечара. Работнікі шклоўскай канторы Загатлён адзін за другім зьнікаюць. Застаецца ў канторы толькі адзін сакратар. Ён заяўляе здатчыкам, каб яны прыехалі за атрыманьнем грошай і квіткоў у другі раз.

В. Зімін.

КУЛАЦКІХ ШКОДНІКАЎ—ДА АДКАЗНАСЬЦІ

АСЬВЕЯ. (Ад нашага спэцыяльнага кар.). Едзеш па шашы на Дрысу—фурманы з ... на кожным кілёмэтры ... нагда тлумачыць:

... не пераараўстановішча рэчаў, адтэрміноўваў супярэчнасьцяй вакол пытаньня аб ваенных даўгох і рэпарацыях.

Але ўсё разьвіцьцё міжнародных адносін на працягу апошняга году ўнесла столькі абвастрэньня, столькі ўскладненьняў ва ўзаемаадносіны імпэрыялістычных дзяржаў, што праблема ваенных даўгоў стала ў даны момант толькі фокусам, у якім адбіваюцца ўсе супярэчнасьці імпэрыялістаў. **Вакол гэтага пытаньня стварыўся вузел супярэчнасьцяй, які зацягваецца ўсё тужэй і тужэй.** Гутарка ідзе ня толькі аб эканамічнай, але і аб глыбока-палітычнай праблеме.

Супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Англіяй зьяўляюцца вядучымі супярэчнасьцямі ў лягеры імпэрыялістаў. Яны, гэтыя супярэчнасьці, пранізваюць усе астатнія міжімпэрыялістычныя супярэчнасьці і накладаюць на іх свой адбітак. У найбольш яўнай форме гэтыя супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Англіяй праявіліся за мінулы год на наступных пытаньнях:

1. У Паўднёвай Амэрыцы жорсткая барацьба паміж ангельскім і амэрыканскім імпэрыялізмам вылілася ў цэлы рад дзяржаўных пераваротаў у розных краінах Паўднёвай і Цэнтральнай Амэрыкі. **Ангельскі імпэрыялізм прабаваў зьвергнуць у гэтых краінах урады, якія арыентаваліся на ПАЗШ, а амэрыканскі імпэрыялізм, са свайго боку, прабаваў зьвергнуць урады, якія арыентаваліся на Англію.** Вайна паміж Балівіяй і Парагваем была толькі формай праяўленьня барацьбы ня толькі паміж Стандарт Ойль і Дэтэрынгам за нафту, але і паміж ангельскім і амэрыканскім імпэрыялізмам наогул. **Вайна паміж Калумбіяй і Пэру мае той-жа сэнс зьмест.**

2. Англія дабіваецца пераразьмеркаваньня залатых запасаў і не згаджаецца, ня гледзячы на націск ПАЗШ, стабілізаваць курс фунта стэрлінгаў, пакуль Злучаныя Штаты ня згодзяцца на больш «рэгулярнае» і справядлівае» размеркаваньне залатых запасаў. А ПАЗШ не жадаюць паступацца сваім золатам і ў сваёй другой ноце прапануюць пераразьмеркаваньне золата ў Эўропе.

3. Ціхаакіянская праблема ўносіць вялікае абвастрэньне ў англа-амэрыканскія адносіны. Ангельскі імпэрыялізм, хаця і ў скрытай форме, патрымліваў японскі імпэрыялізм у наступленьні на Кітай і ў захопе Манчжурыі для таго, каб завяваць на свой бок Японію ў якасьці саюзьніка ў барацьбе супроць ПАЗШ. Цэлы рад выдатных капітанаў гаварыў на стойваў, што **ангельскі імпэрыялізм імкнецца да аднаўленьня англа-японскага ваенна-палітычнага саюзу**, скасаванага толькі ў 1921 г. пад націскам ПАЗШ на Вашынгтонскай канфэрэнцыі.

Пастанова тройкі аб аддачы пад суд былога старшыні сельсавету Дубры ня выканана.

Злачынна адстае і Задзежынскі сельсавет, які плян ільназагатовак выканаў на 20,8 проц. Гэты сельсавет—рашаючы ільнарайон раёна. Тут сканцэнтраваны моцныя парлія, Кан... став, Бога. Што зрабіў супроць саюзу ... партыі нстар замежных спраў Саймон у часе абгаварэньня дакладу Літ... на, як адвакат японскага імпэрыялізму.

4. Новае вялікае абвастрэньне ва ўзаемаадносінах паміж Англіяй і ПАЗШ унесла Оттаўская канфэрэнцыя. Спроба ангельскага імпэрыялізму мацней зьвязаць імпэрскае адзінства, увядзеньне сыстэмы імпэрскай перавагі, якая ажыцьцяўляецца цаною вялікіх ахвяр з боку ангельскага імпэрыялізму, увядзеньне пераважных мытаў для ангельскіх тавараў у Канадзе, Аўстралі, Паўднёвай Афрыцы, Новай Зэляндыі, а таксама ў Індыі, прадастаўленьне кантынгентаў па ўвозе с.-г. тавараў у Англію брытанскім дамініёнам нанесьлі ўдар амэрыканскаму вывазу, затрудніўшы барацьбу ПАЗШ за замежныя рынкі. Вось чаму ноты ПАЗШ Англіі пазрэзьліваюць, што ўрэгуляваньне пытаньня аб даўгох залежыць ад пашырэньня рынкаў для сельскай гаспадаркі і прамысловасьці ПАЗШ.

5. Нясумненна, што праблема ўзбраеньня, пастаўленая ва ўвесь рост Жэнэўскай канфэрэнцыяй, таксама абвастрыла супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Англіяй.

Супярэчнасьці паміж Францыяй і Злучанымі Штатамі носяць іншы, менш вострый характар, чым канфлікт паміж ПАЗШ і Англіяй. Калі барацьба паміж Англіяй і ПАЗШ ёсьць барацьба паміж зьвюма буйнейшымі імпэрыялістычнымі дзяржавамі за ўладаньне сьветам, то пытаньні, вакол якіх французкія і амэрыканскія імпэрыялісты вядуць барацьбу, зьяўляюцца не настолькі ўсеагульнымі і ўсеазначэльнымі з пункту гледжаньня ўзаемаадносін імпэрыялістычных дзяржаў. Паміж Францыяй і Злучанымі Штатамі ішла і ідзе барацьба за золата, і французкія аталі на курс даляра, па заяве Гувэра, ледзь не сарвалі ўжо ўстойлівасьць даляра.

Пастаянна, што ПАЗШ супраціўляюцца імкненьню французкага імпэрыялізму да гегемоніі на эўрапэйскім кантынэнце. Паколькі ПАЗШ маюць буйнейшыя эканамічныя інтарэсы ў Германіі, яны супраціўляюцца далейшаму эканамічнаму і палітычнаму пашырэньню Германіі гегемоніі французкага імпэрыялізму. Калі французкі імпэрыялізм зьяўляецца найбольш ярым абаронцам эрсальскай сыстэмы, міжнародным яе жандарам на Захадзе, то ПАЗШ былі-б не ад таго, каб патрымаць Германію ў яе прэтэнзіях на перагляд усходніх границ, хаця ўсе гэтыя пытаньні могуць

Чорная дошка грэбуючым загатовак

Пастановай СНК БССР і ЦК КП(б)Б занесены на чорную дошку наступныя раёны і сельсаветы:

Раёны:

1. Талачынскі, 2. Горацкі, 3. Кармянскі, 4. Дубровенскі, 5. Асьвейскі,

Сельсаветы:

па Чачэрскім раёне: Глыбачанскі,
па Буда-Кашалеўскім: Нядальскі, Патапаўскі і Губіцкі,
па Менскім раёне: Папярнянскі,
па Віцебскім: Старасельскі і Рудакоўскі,
па Сеньненскім: Машчонскі і Алексінскі,
па Дзяржынскім: в. в. Станкава, Каменка і Шатаноўшчына,
па Пятрыкоўскім раёне: Асавецкі, Пціцкі і Нэлюшчавіцкі сельсаветы
па Клімавіцкім раёне: Красавіцкі сельсавет,
па Лепельскім раёне: Ляхаўскі сельсавет і вёскі Бабча, Круглицы і Стальбцы,
па Чэрыкаўскім раёне: Каменскі сельсавет,
па Бягомльскім раёне: Дамаржыцкі сельсавет,
па Чавускім раёне: Праздкоўскі, Рабаўскі і Дзеднаўскі,
па Лагойскім раёне: Гайнінскі,
па Нараўлянскім раёне: Мухаедаўскі, Хаткоўскі,
па Чашніцкім раёне: Ульянавіцкі,
па Магілеўскім раёне: Вышаўскі, Хонаўскі, Рафалаўскі, Гусьпішчанскі,
па Сіроцінскім: Заранаўскі і Мішкаўскі,
па Клічаўскім: Біркаўскі, Грыбавецкі, Даўжанскі і Дубеньскі,
па Сураскім: Камароўскі і Войтаўскі,
па Аршанскім: Буеўскі,
па Пухавіцкім: Гарэліцкі, Слабодзкі, Задашчанскі і Шацкі,
па Вушацкім раёне: Чаранаўшынскі і Усайскі сельсаветы,
па Крычаўскім: Цяшанскі сельсавет,
па Дрысенскім раёне: Юзэфоўскі і Каркапеўскі,

Аб мерапрыємствах супроць найбольш адстаючых раёнаў

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б

За зрыў дзяржаўных загатовак збожжа (80,1 проц. выкананьня на 1/1-33 г.) і па ільну (58 проц. выкананьня па 1/1) Чавускі раён занесьці на **чорную дошку.**

За зрыў дзяржаўных загатовак ільну (выкананьне 45,4 проц. на 1/1-33 г.) занесьці на **чорную дошку** Сененскі раён.

У адносінах да гэтых раёнаў, занесеных на чорную дошку, дастасаваць наступнае:

1. Безадкладна спыніць падвоз тавараў у гэтыя раёны і поўнасьцю спыніць каапэрацыйны і дзяржаўны гандаль на месцы. Вывезьці з каапэрацыйных крам і складаў райспажыўсаюзу гэтых раёнаў усе наяўныя прамтавары і накіраваць іх у іншыя сельскія раёны, якія з посьпехам выконваюць плян дзяржаўных загатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў.

2. Поўнасьцю забараніць да выкананьня пляну калгасны гандаль як для калгасаў і ... пасобнікаў.

... вях. У той час, як фінансавы капітал ПАЗШ імкнецца да скарачэньня ваенных выдаткаў эўрапэйскіх краін, каб забясьпечыць аплату дзяржаўных і прыватных даўгоў эўрапэйскіх краін Злучаным штатам, французкі імпэрыялізм ня збіраецца скарачаць сваіх узбраеньняў.

Далейшыя ўскладненьні былі ўнесены ва ўзаемаадносінах паміж Францыяй і ПАЗШ у рэзультаце Лёзанскай канфэрэнцыі. Як вядома, у часе Лёзанскай канфэрэнцыі Англія, Францыя і рад іншых эўрапэйскіх дзяржаў заключылі славутую «джэнтльменскую згоду» аб тым, што ўрэгуляваньне рэпарацыйнага пытаньня ўступае ў моц толькі ў тым выпадку, калі Злучаныя Штаты вызваліць сваіх эўрапэйскіх даўжнікоў ад плацяжоў па ваенных даўгох. У гэтай «джэнтльменскай згодзе», якая стварыла ўмову паміж рэпарацыйнымі плацяжамі і ваеннымі даўгамі, Злучаныя Штаты ўбачылі спробу стварэньня эўрапэйскага адзінага фронту супроць ПАЗШ па пытаньні аб даўгох. У часе Лёзанскай канфэрэнцыі Англія і Францыя заключылі славуты «пакт аб давер'і», у якім яны абавязваліся ўзгадняць свае выступленьні па пытаньнях, выкананых на Лёзанскай канфэрэнцыі, а таксама па пытаньнях, якія паступяць абгаварэньню на Жэнэўскай канфэрэнцыі. У гэтым пакце аб давер'і Злучаныя Штаты ўбачылі сур'ёзны крок да аднаўленьня англа-французкай антанты на новых пачатках, з новым зьместам, прычым Вашынгтон не без падставы падазраваў, што англа-французкае збліжэньне накіравана і супроць ПАЗШ.

Ня гледзячы на наяўнасьць гэтых рэакцыонных, супярэчнасьці паміж Францыяй і ПАЗШ, як бы яны рэальныя ні былі, зусім ня носяць такога глыбокага характэру, як супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Англіяй, і зусім не выключаюць згоды паміж абедзьма краінамі. Патрымліваньне японскага імпэрыялізму Кітай нацыі, гэта значыць французкім і ангельскім імпэрыялізмам, «джэнтльменская згода», заключаная ў Лёзане, г. зн. спроба да стварэньня адзінага эўрапэйскага блёку супроць ПАЗШ, лёзанскі пакт аб давер'і, г. зн. збліжэньне паміж Англіяй і Францыяй, шчыльнае супрацоўніцтва паміж французкім і японск

Ачысьціць пізавы савецкі і загатоучы апарат ад кулацкіх лазутчыкаў!

Замест рашучага націску—упрошваньні і мольбы

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. Кулакі і заможнікі в. Барэйкі, Баронькаўскага сельсавету, скарыстоўваючы гнілы лібералізм партячэйкі і сельсавету, сабатуюць збожжазагатоўкі. Ближэйшае азнаямленьне са становішчам загатовак збожжа на вёсцы выразна паказвае, да чаго прывяло прытуляньне клясавай пільнасьці ў асобных зьвенных партыйных і савецкіх арганізацыях.

У в. Барэйках ёсьць новыя кулгас з 40 гаспадарак. Большая частка гаспадарак вёскі — адноасобнікі. Апошнія атрымалі заданьне па здачы збожжа ў 158 цэнтн. Сёлетні ўраджай збожжа ў вёсцы добры. Паводле статыстычных даных, з аднаго га пасеву атрымана 6-7 цэнтн. збожжа. Пры заданьні ў 158 цэнтн., з аднаго га азімага і яравога кліну па в. Барэйкі треба здаць дзяржаве ўсяго 3 пуды ў сярэднім. Гэта мізэрная лічба, якая гаворыць аб поўнай рэальнасьці пляну. І ўсё-ж у гэтай вёсцы загатоўкі ідуць вельмі дрэнна. Выканана ня больш 30-35 проц. гадавога пляну.

У вёсцы ёсьць 8 заможных гаспадарак, цьвёрдыя заданьні з іх не спагнаны. Партячэйка і сельсавет ня прынялі ніякіх мер, каб спагнаць збожжа з кулака і заможніка.

Замест рашучага націску на клясава-варожыя элементы, паасобныя члены партыі ўгаварэлі куланоў здаць колькі - небудзь. Кулакі, бачыўшы бездапаможнасьць мясцовых арганізацый, абнаглелі і адмаўляліся здаваць збожжа, адыгрываючы ролю шкрыўджаных жабракоў. Члены партыі — сакратар партячэйкі **Сьлёзкін** і старшыня Баранькаўскага сельсавету **Хомчанка** ім паверылі. Пасьля гэтага першага абходу да кулакоў больш не ходзілі, парашылі, што цьвёрдыя заданьні даны памылкова. Кулаком і заможнікам — Мартынёнку, Якавенку, Сімянцову і інш. дан шырокі прастор для падрыўной антысавецкай работы, для байкоту загатовак. Паддаўшыся на шаланкаўнную агітацыю кулака, частка беднякоў і сераднякоў вёскі пацягнулася за своатаймітамі. Тут далі сябе адчуваць зусім дрэнная масавая работа сярод працоўных адноасобнікаў. Замест гэтай работы, баранькаўскія камуністы шукалі прычыны невыканаўня пляну ў «пераобтяжанасьці заданьня».

Літаральна па вачох мясцовых работнікаў кулакі і заможнікі пакілі збожжа, хавалі яго ў ямах, вывозілі на рынак.

Азнаёміўся бліжэй са складам Баронькаўскай ячэйкі.

Сакратар **Сьлёзкін** — сын кулака з суседняга сельсавету. Увесь час трымаў сувязь з бацькамі, якія таксама сабатуюць загатоўкі.

Старшыня сельсавету, член КП(б)Б, **Хомчанка** — яўны аппартуніст. Кажаму, хто прыязджае па збожжазагатоўках на вёску, ён імкнуўся даказаць, што збожжа ў вёсцы няма. Рад членаў партыі, замест барацьбы за збожжа, бралі пад абарону кулакоў і заможнікаў.

Ніякай работы не праведзена сярод калгасьнікаў. Тэму ёсьць выпадкі, калі калгасьнікі хавалі ў сябе збожжа сваякоў і заможнікаў, калі, замест буксіру пад алетальмі адноасобнымі гаспадаркамі, яны самі ішлі на поводзе ў клясава-варожых элементаў.

Вось тыр злосных зрыўшчыкаў загатовак, арганізатароў кулацкага сабатажу. **Якавенка Алесь** — заможнік-серадняк, мае больш 6 га зямлі, павінен быў здаць дзяржаве 15 пудоў збожжа, здаў толькі 2 пуды, каторыча заявіўшы, што колькі ў яго ня будзе шукаць, нічога ня знойдуць. Пры дапамозе лепшых беднякоў і сераднякоў удалося выкрыць у яго нахаемны сьвіран, у ямах было 250 кгр. гатовага жыта. Сазон **Марынёнка** і Якуб **Семянцоў** — кулакі, арганізатары сабатажу; у іх знойдзена ад 200 да 400 кгр. закапанага збожжа.

Паўстае пытаньне, дзе былі райком і РВК, чаму яны трымалі ў партыі агентаў і памочнікаў кулака?

Треба адзначыць, што і іншыя сельскія ячэйкі Касьцюковіцкага раёну засьмечаны варожымі элементамі.

Кандыдат партыі Бярозкаўскай ячэйкі **Салдаценка** схаваў кулацкае збожжа.

Член партыі **Балухін** — старшыня В.-Ліпаўскага сельсавету, член калгасу «Перамога», замест ачысткі калгасу ад кулацкіх элементаў, дапусьціў, што калгас ня здаў ні аднаго цэнтнэра бульбы, а разьмеркаваў не сярод калгасьнікаў. Тое самае і з ільном: ня выканаў пляну загатовак, а разьмеркаваў валакно паводле кулацкага прынцыпу.

Член партыі **Абрамаў** — старшыня калгасу «Чырвоная ячэйка», Хоцінскага сельсавету, ня выканаў пляну загатовак ільну, а 250 пудоў трасты разьмеркаваў сярод калгасьнікаў. Кандыдат партыі **Канькоў** — старшыня калгасу «Прагрэс», Елавецкага сельсавету, не прыступіў яшчэ да здачы пасеншазыкі, разважаючы, прыкладна, так: «А можа абыйдземся без звароту пазыкі».

Ворагі-дыктатуры пралетарыяту, здрадніки партыі павінны быць выгнаны з яе радоў. Перараджэнцы з партбілетам у кішэні небясьпечней за адкрытага ворага.

Выязная рэдакцыя «Рабселькора»:
Ц. Гербуноў, Ю. Бялько, Прахарэнка.

Упаўнаважаны Паўлоўскі дапамагае кулакам

СІРОЦІНА. Пагарэліцкі сельсавет зрывае выкананьне загатоўчага пляну. Упаўнаважаны райкому і РВК, нам. старшыні РВК **Паўлоўскі** прасядзеў у гэтым сельсавеце паўтара месяца, але патураючы клясава-варожым элементам, ён яшчэ больш паглыбіў прарыў па загатоўках. Ён зьняў цьвёрдыя заданьні з 15 гаспадарак, пакінуўшы толькі 4-м.

Возьмем, для прыкладу, гаспадарку Ахрэма Аўсянкіна з в. Марозава. Ён мае 26 га зямлі, ападаткованы індывідуальна, павінен здаць 40 пудоў бульбы і 3 пуды збожжа, а бядняк в. Запольле Дзяніс Жолудаў у парадку самаабвязацельства павінен здаць 30 пудоў збожжа і 70 пудоў бульбы. Ясна, што мы тут маем справу з патураньнем заможным элементам. Цікава, што Аўсянкін здаў 40 пудоў бульбы, у той час, як ён сабраў ураджаю 9 тон. Паўлоўскі даў кулаку магчымасьць разбазарыць збожжа і бульбу, а ў той-жа час ён забраў насенныя фонды ў радзе калгасаў, у якасьці «пазычкі».

Уміснуў цьвёрдыя заданьні і заможнік **Куклінскі Рыгор**, які мае 14 га зямлі, спекуляваў увесь час збожжам, прадаў у Віцебску 30 пудоў. Яго самаабвязацельства не перавышае 32 кгр. жыта, прычым яно не здано дагэтуль. Зьнята цьвёрдае заданьне з Кухаравэ Панкрата, у якога знойдзена 80 пудоў захаванага збожжа. Цікава, што Упаўнаважаны РК зашэўніў усіх, што ў Кухаравэ збожжа няма.

Пры патураньні старшыні сельсавету **Шчукіна** арганізаван кулацкі сабатаж і ў Жарэбіцкім сельсавеце. Шчукін — моцны серадняк, адноасобнік, зрошся з кулакамі, дапамагае ім зрываць загатоўкі, вядзе гутаркі сярод сялян, што плян поўнасьцю ня можа быць выканан, бо ён нерэальны.

Такіх «камуністаў» треба неадкладна выключыць з партыі і аддаць пад суд.

Гамелька.

Передавікі загатовак

СУРАЖ. (Па тэлеграфу). Передавіком у выкананьні пляну па ўсіх відах загатовак зьяўляецца ПУДЖСКІ сельсавет.

Сельсавет выканаў на 1-га студзеня заданьне па ільну на 102,2 проц., па ільнасемі—на 105 проц., па збожжы—на 118 проц., па сене—на 101 проц., па бульбе—100 проц., па мясе — 144 проц.

Пуджскі сельсавет змагаецца за даўсканалае перавыкананьне пляну. УЗЯТЫ НА БУКСІР ВОЙТАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ, КУДЫ ВЫСЛАНА БРЫГАДА З 6 КАЛГАСЬНІКАЎ І 4 АДНААСОБНІКАЎ—ПЕРАДАВІКОЎ ЗАГАТОВАК.

АЎДЗЕЙЧЫКАЎ.

РАЕСНЫ. Юкавіцкі сельсавет першым у раёне рапартаваў аб перамозе на фронце загатовак. Яшчэ 25 сьнежня сельсавет выканаў пляны па асноўных відах загатовак: па ільнавалакну—на 101,8 проц., па збожжа—на 152,8 проц., па бульбе—на 102 проц. і г. д.

Добрыя паказальнікі рабіў даў сельсавет і ў галіне лесазагатовак.

Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы мабілізацыі ўсіх партыйна-камсамольскіх сіл, правільнай расстаноўцы іх і рашучай барацьбы з супраціўленьнем клясава-варожых элементаў і іх агентуры.

ІЛЮШЭНКА.

Не складаць зброі!

ГЛУСК. (Наш спецкар.). Макавіцкі сельсавет можа гаварыцца сваім сакратаром. Гэта не сакратар, а «хадзячая энцыклёпедыя». Тав. Дашчэня, не заікнуўшыся, адкажа вам на любое запытаньне, дасьць даведку.

Яму ня трэба капацца ў справах, шукаць зводак, ён усё трымае ў памяці.

— Як выкананы пляны загатовак?

— Па збожжы — на 100 проц., па мясе — 114 проц., па бульбе — 75 проц.

— А кулацка-заможная частка?

— На 140 проц.

— Калгасы?

— На 108 проц. Адстаюць адноасобнікі. Сабатуюць заможнікі з вёсак Калюга і Вольніца.

У 5 гадзін вечара 29 сьнежня Макавіцкі сельсавет рапартаваў: плян збожжазагатовак выкананы поўнасьцю.

Пытаемся ў сакратара парт'ячэйкі т. Курыкава, чаму сельсавет ня выканаў пляну да 25 сьнежня.

Курыкаў імкнецца пешта прыдумаць у сваё апраўданьне. Адзак довады не пераканаўчыя, і таму, прывёўшы пару іх, Курыкаў пачаў за лешчае маўчаць.

Аб сапраўдных прычынах зацягваньня загатовак паведаміў брыгадзір т. Куроўка:

— У гэтым сельсавеце згарэла пекалькі двароў, на якія прыпадала плянавае заданьне ў 7 тон. Сельсавет думаў, што з яго зьнімуць гэтыя 7 тон, думаў і чакаў, а раён у сваю чаргу ня даў ніякіх канкрэтных указаньняў. Вось толькі цяпер абвешчана, што гэтыя 7 тон зьняты ня будуць. Вышла так, што сельсавет дачакаўся да апошніх дзён, а выканаць плян можна было даўно.

Падвяла непаваротлівасьць раёну і спадзяваньне сельсавета на «а можа».

Сельсавет выканаў плян збожжазагатовак, але гэта ня значыць, што кожны гаспадар выканаў сваё заданьне. Вёскі Калюга, Вольніца, Дуброва ня здалі і паловы заданьня. Загатоўкі заверыцца за кошт перадавых вёсак Сэлца, Бабірава і інш., перавыкананўшых свае пляны. Ёсьць шмат гаспадарак, паміж імі нямала заможных, якія дагэтуль сабатуюць здачу збожжа.

Краіна патрабуе 100 проц. выкананьня пляну загатовак кожнай гаспадаркай. Таму дэмабілізоўваецца ні ў якім разе нельга. А дэмабілізацыйныя тэндэнцыі ёсьць. Упаўнаважаны РК т. Куліш цацірае руні: «Сёньня канчаю загатоўкі і еду да хаты, ня быў ужо цэлы тыдзень». Сакратар парт'ячэйкі адпачывае ад загатоўчай гарачкі, займаецца хатняй гаспадаркай. Брыгадзіры сядзяць у сельсавеце і сумуюць.

Асобна аб старшыні сельсажыўтаварыства т. **Іванкевічу**. Гэты, з дазволу сказаць, камуніст увесь час ухітраецца ўхіліцца ад удзелу ў загатоўках. То яму трэба быць у канцылярыі, то неабходна ехаць у Глуск, а яго пункт — в. Вольніца — без адказнага брыгадзіра. Ня дзіва, што яна выканала свой плян толькі на 50 проц.

РКК павінна праверыць палітычны твар Іванкевіча, якому «няма часу займацца загатоўкамі».

Чыгун.

Змылі ганебную пляму

КРУПКІ. Ігрушацкі сельсавет за злоснае і сыстэматычнае невыкананьне пляну дзяржаўных загатовак, за сабатаж, арганізаваны кулацкімі элементамі, пастановай РВК быў занесен на чорную дошку. Гэта адзіны сельсавет у раёне, які з году ў год цягнуўся ў хвасьце па ўсіх гаспадарча-палітычных кампаніях на вёсцы. Асабліва адставаў сельсавецкі цэнтр — вёска Ігрушка, якая налічвае 180 двароў.

Наколькі вялік быў сабатаж, арганізаваны клясава-варожымі элементамі, сьведчыць той факт, што Ігрушацкі сельсавет да 21-га сьнежня выканаў плян збожжазагатовак толькі на 36,5 проц. Няма патрэбы даказваць, што гэты кулацкі сабатаж мог даць месца толькі з прычыны лібэральных адносін з боку парт'ячэйкі і сельсавету, у якіх прытупілася клясавая пільнасьць на адказнейшым вучастку сацыялістычнага наступленьня.

Бюро Крупскага райкому своечасова выкрыла гнілы лібералізм паасобных перараджэнцаў з Ігрушацкай парт'ячэйкі, зьняло з работы і выключыла з партыі сакратара парт'ячэйкі ЮРКЕВІЧА і інш.

Ачысьціўшыся ад гнілога апартуністычнага кіраўніцтва, Ігрушацкая ячэйка здолела выправіць дапушчаныя памылкі, па-баявому арганізаваць калгасныя і працоўныя масы вёскі на барацьбу з кулацкім сабатажам, правільна расставіць сілы на рашаючых вучастках.

Дзякуючы гэтаму, Ігрушацкі сельсавет з 25 сьнежня крута ўзьняў тэмпы загатовак. Плян па збожжы выканан поўнасьцю, па мясу перавыкананы, па ільну выканан на 78 проц., па бульбе — на 98 проц.

Узоры барацьбы за плян паказалі калгасы «Іскра», «Молат» і «Чырвоны востраў». Цалкам выканалі пляны загатовак па ўсіх відах вёскі Ляды, Вострава і Ротань.

Аб тым, якімі манэўрамі дзейнічае клясавы вораг, сьведчыць гісторыя з кулаком **СКАЧКОМ**. Клясава-варожы элемэнт, каб забясьпечыць сабе поле дзейнасьці, прапхае ў калгасы, МТС, савецкія установы. Кулак вёскі Самаседаўка Скачок Іван зрабіўся конюхам у МТС, атрымаў там спэцвопратку, яго ледзь не перавялі на рабочае снабжэньне. Гэты «пралетары» ня здаў дзяржаве 8 пуд. збожжа, 50 пуд. бульбы і інш. Конюх Скачок давёў транспарт МТС да заняпаду. Кулацкі лазутчык зараз выкінут з МТС, але пад суд яшчэ не аддены.

Калышанцы

„ЛЕНІНСКІ СЬЦЯГ", ЛЁЗНА

Калышанцы пыталіся:

«**ЧЫМ-ЖА** вы горшыя за нас? Чаму вы, нашы суседзі, адсталі з апрацоўкай і здачай (продажам) ільну дзяржаве»?

Справядлівае пытаньне. Што маглі сказаць суседнія з калышанцамі сельсаветы наўночных ільнаводных раёнаў? Нічога. Няма чым апраўдацца. Нічым ня горшыя (у сэнсе ўмоў працы, зразумела).

Калгасьнікі і адноасобнікі **КАЛЫШАНСКАГА** сельсавету загадзя папярэдзілі магчымыя спробы в боку ільнаводных раёнаў спасылацца на так званыя «аб'ектыўныя прычыны». У сваім адкрытым лёсьце да ўсіх калгасьнікаў і адноасобнікаў ільнаводчых раёнаў БССР калышанцы пісалі:

«**УМОВЫ** ў нас **АДНОЛЬКАВЫЯ**. І мы маем поўнае права запытаць, чаму вы, таварышы, так зацягнулі перапрацоўку ільну і здаецце валакно і трасту нізкай якасьці»?

Толькі пяць ільнаводчых раёнаў выканалі дырэктыву ЦК УсеКП(б) аб загатоўцы ільнапрадукцыі да 1 студзеня ў размеры 70 проц. гадавых заданьняў. Толькі тры раёны—Лёзна, дзе знаходзіцца і Калышанскі сельсавет, Дрыса і Чашнікі—шчыльна падышлі да завяршэньня ільназагатовак.

Ну, а самі калышанцы? Як яны спраўляцца з пляннамі апрацоўкі і здачы ільну дзяржаве? Адкрыты лёст калгасьнікаў і адноасобнікаў сельсавету, зьмешчаны яшчэ ў лістападзе на старонках лёзьнянскай газэты «**ЛЕНІНСКІ СЬЦЯГ**», дае поўны і вычарпальны адказ.

Ужо тады, калі асноўныя ільнаводчыя раёны толькі прыступалі да апрацоўкі ільну, Калышанскі сельсавет на справе разгарнуў гераічную барацьбу за лён. Для калышанцаў не існаваў факт невыкананьня норм. Нават самыя высокія заданьні па пераапрацоўцы ільну былі **ПЕРАВЫШАНЫ** амаль ва ўсіх калгасах. Нормы для трапаль пчыц у 14 кілё валакна на працадзень калгасьніцы Калышанскага сельсавету перавысілі ў **ДВА** і нават **ТРЫ** разы:

«**ШМАТ** ёсьць ударнікаў у нас,—пісалі калышанцы,—якія перавыконваюць нормы ў два-тры разы пры высокай якасьці працы.

У калгасе «Авангард» **М. БАБАЕВА** давала па **38** кілё ў дзень, **А. ХМЯЛЕВА — 35** і **БОНДАРАВА Ф. — 33** і г. д. і т. д.».

38 кілё чыстага валакна за дзень! А такіх калгасьніц-энтузіястак сацыялістычнай працы, як М. Бабаева, у калгасах Калышанскага сельсавету многія дзесяткі.

Правільная расстаноўка жывых людзей—першая прычына перамогі калышанцаў. Другая—у тым, што барацьба за лён стала для калышанцаў справай гонару, справай геройства, мужнасьці і адвагі.

Лёст паказвае, як калгасы сельсавету арганізавалі сваю працу (колькасьць калгасьнікаў на паасобных працэсах апрацоўкі, нагрузка машын, улік прадукцыйнасьці работы тожнага сушыльшчыка, пакавальшчыка, трапальшчыцы, і г. д., **САРТАВАНЬНЕ** ільнавалакна).

Чакаем ад вас канкрэтнага адказу ільном!».

«Адкрытыя лісты» нярэдка сустракае самы пенчасьлівы лёс. Нашы раённыя газэты вымяшчаюць дзесяткі ўсякіх «адкрытых лістоў» па розначастайных тэмы. Але як часта гэты метад работы **АПАШЛЯЕЦЦА**. Як часта «адкрытыя лісты» ператвараюцца ў алілюйскае пустазвонства, ад якога карысьці ні на капейку. Аб лісьце забываюць адразу на другі дзень пасьля яго зьмяшчэньня. Многія рэдакцыі, апублікаваўшы яго-небудзь лёст, нават і не падумаюць, што на гэтым справа не вычарпаецца, што трэба штодзённа і дзённа змагацца за практычнае выкананьне ўсіх пытаньняў, узьнятых у лісьце.

«Ленінскі сьцяг»—орган лёзьнянскага райкому партыі—цяпер пайшоў па гэтай шкодным сьцежцы. Лёст калышанцаў не хаваўся толькі прыгожым словам. Рэдакцыя зрабіла гэты лёст праграмай барацьбы за лён.

З нумару ў нумар яна асьвятляе работу калышанцаў. З нумару ў нумар паказвае, як яны выконваюць свае слова. З нумару ў нумар вучыць адсталыя сельсаветы і калгасы, як працаваць па-калышанску.

А працаваць па-калышанску гэта значыць:

«**АДНААСОБНІКІ** Калышанскага сельсавету выконваюць свае абавязкі перад дзяржавай. Напярэдадні перад вёска Зябкі, якая выканала плян ільназагатовак на **80 проц.**

Вёска мае сваіх ударнікаў. А. Клалова здала дзяржаве замест 0,9 цэнт. ільну па пляну—**1,65** цэнт.; А. Віноградава замест 0,8—**1,36**; Л. Бычанкова замест 1,2—**1,6**.

Вёска Зябкі—перадавік і па **ЯКАСЬЦІ** ільну (**ВЫШЭЙШАЯ СОРТНАСЬЦЬ**)».

Забкаўцы праз газэту абяцалі, што выканаюць у бліжэйшы час усе пляны загатовак на 100 проц. **І ВЫКАНАЛІ!** «Ленінскі сьцяг» даёў справу да канца. Выканаўшы свае абавязкі перад пралетарскай дзяржавай, угарайшыя адноасобнікі в. Зябкі сталі сёньня калгасьнікамі.

16 сьнежня, рапартуючы аб выкананьні загатоўчых пляна, яны заявілі праз «Ленінскі сьцяг»:

«**МЫ ЗРАЗУМЕЛІ** перавагу калектыўнай гаспадаркі і ўступаем на аснове поўнай добраахвотнасьці ў калгас «Ільліч».

А працаваць па-калышанску гэта значыць:

«**НА 28 СЬНЕЖНЯ** Калышанскі сельсавет выканаў гадавы плян здачы ільну дзяржаве на **107,4** проц. **УСЕ** калгасы ў сельсавеце **ПЕРАВЫКАНАЛІ** свае пляны.

АДНААСОБНІКІ здалі дзяржаве ільвалакна ў размеры **102,2** проц. гадавога пляну».

Сваё слова калышанцы з гонарам стрымалі!

Перавышан ня толькі агульны плян па сельсавету. Калышанцы дамагліся поўнага выкананьня пляна па здачы ільнапрадукцыі дзяржаве кожным калгасам, кожнай працоўнай адноасобнай гаспадаркай.

Дзесяткі адноасобнікаў здалі дзяржаве з 1½—2 разы больш збожжа і [illegible]

ПАТРЭБНЫ НЯ СЛОВЫ, А ЛЁН...

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Партарганізацыя Полаччыны — адна з буйнейшых у групе ільнарошчых раёнаў. Яна налічвае 1.600 на ваенных даўгох паміж Англіяй і Францыяй у фінансавых адносінах у вельмі цяжкое становішча. Сьнежаньскі ўзнос, які Англія павінна была зрабіць Злучаным Штатам, складае 93 млн. даляраў. Адпак, у той-жа час ангельскаму казначэйству прыходзіцца заплаціць каля 80 млн. даляраў за выкуп тых дзяржаўных аблігацый, замежныя ўласьнікі якіх не згадзіліся на канвэрсію па найбольш нізкім пропанце. Ангельскае казначэйства, такім чынам, стаіць перад задачай перавесьці каля 173 млн. даляраў за граніцу.

Акрамя таго, прадстаіць яшчэ плацяжы па даўгох, заключаных па стабілізацыі фунта стэрлінгаў у 1931 г. Гэтыя моманты даюць тлумачэньне рэзкага зьніжэньня курсу фунта стэрлінгаў. Гэтымі-ж моментамі тлумачыцца і тое, што ў лягеры ангельскай фінансавай алігархіі разгарэлася вострэйшая барацьба па пытаньні аб тым, плаціць ці не. Унясеньне сьнежаньскіх плацяжоў азначае далейшае абясцэненьне фунта стэрлінгаў.

Але ці можа Англія, якая займае ўсё яшчэ другое месца па сусьветным гандлёвым рынку, а ў галіне фінансаваньня замежнага гандлю, судаходства, страхаваньня першае месца, абвясьціць сябе неплатаздольнай? Ці можа Англія, якая мае замежныя капіталаўкладаньні ў памеры 4 млрд. фунтаў стэрлінгаў, значыць каля 40 млрд. рублёў золатам, абвясьціць сябе неплатаздольнай і тым самым надаць небясьпечны прыклад сваім уласным даўжнікам? Ці можа ангельскі ўрад, які мае ўнутраную запазычанасьць у памеры 7,4 млрд., абвясьціць сябе неплатаздольным і тым самым напосьці непаправімы ўдар усёй сусьветнай прэтытай сыстэме — прынцыпу сьвятасьці дагаворэў?

З другога боку, бясспрэчна, што ўнясеньне плацяжоў на ваенных даўгох надзвычай абвастрае і без таго прытычнае становішча ангельскага бюджэту.

Вось чаму ангельскі ўрад так упарта змагаўся за атэрмінаваньне плацяжоў. Але іменна таму ўрад ПАЗШ адхіліў усе ангельскія ноты, усе ангельскія аговоркі. Некаторыя думалі, што міжнародныя банкіры ў ПАЗШ запікаўлены ў ануляваньні ваенных даўгоў і будуць аказваць націск на Гувэра ў гэтым сэнсе для таго, каб забясьпечыць плацяжы па прыватных і замежных даўгох, а ў Цэнтральнай Эўропе — **Германія, Вэнгрыя,** [illegible] проц. выкананьня пляну ільназагатовак [illegible] Зрывае ільназагатоўкі і Шчукін выбух сусельсавет. Плян выкананьня аб ваенных Старшы і рэпарацыях.

Але ўсё разьвіцьцё міжнародных адносін на працяку апошняга году ўнесла столькі абвастрэньня, столькі ўскладненьняў ва ўзаемаадносінах імпэрыялістычных дзяржаў, што праблема ваенных даўгоў стала ў даны момант толькі фокусам, у якім адбываюцца ўсе супярэчнасьці імпэрыялістаў. **Вакол гэтага пытаньня стварыўся вузел супярэчнасьцяй, які зацягваецца ўсё тужэй і тужэй.** Гутарка ідзе ня толькі аб эканамічнай, але і аб палітычнай праблеме.

Супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Англіяй зьяўляюцца вядучымі супярэчнасьцямі ў лягеры імпэрыялістаў. Яны, гэтыя супярэчнасьці, пранізваюць усе астатнія міжімпэрыялістычныя супярэчнасьці і накладаюць на іх свой адбітак. У найбольш яўнай форме гэтыя супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Англіяй праявіліся за мінулы год на наступных пытаньнях:

1. У Паўднёвай Амэрыцы жорсткая барацьба паміж ангельскім і амэрыканскім імпэрыялізмам вылілася ў цэлы рад дзяржаўных пераваротаў у розных краінах Паўднёвай і Цэнтральнай Амэрыкі. **Ангельскі імпэрыялізм прабаваў зьвергнуць у гэтых краінах урады, якія арыентаваліся на ПАЗШ, а амэрыканскі імпэрыялізм, са свайго боку, прабаваў зьвергнуць урады, якія арыентаваліся на Англію.** Вайна паміж Балівіяй і Парагваем была толькі формай праяўленьня барацьбы ня толькі паміж Стандарт Ойль і Дэтэрдынгам за нафту, але і паміж ангельскім і амэрыканскім імпэрыялізмам агулам. **Вайна паміж Калумбіяй і Пэру мае тай-жа сакавы зьмест.**

2. Англія дабівалася перагрэмеркаваньня залатых запасаў і не згаджалася, ня гледзячы на націск ПАЗШ, стабілізаваць курс фунта стэрлінгаў, пакуль Злучаныя Штаты ня згодзяцца на больш «рэвізіўнае» і спра вядлівае» разьмеркаваньне залатых запасаў. А ПАЗШ не жадаюць паступацца сваім золатам і у сваёй другой ноце прапануюць перагрэмеркаваньне золата ў Эўропе.

3. Ніхаджінская праблема ўносіць вялікае абвастрэньне ў англа-амэрыканскія адносіны. Ангельскі імпэрыялізм, хаця і ў скрытай форме, пастрымліваў японскі імпэрыялізм у наступленьні на Кітай і ў захопе Манчжурыі для таго, каб завяваць на свой бок Японію і якасьці саюзьніка ў барацьбе супроць ПАЗШ. Цэлы рад выдатных канцэ чатараў на ўстойваў, што **ангельскі імпэрыялізм імкнецца да аднаўленьня англа-японскага ваенна-палітычнага саюзу,** скасаванага толькі ў 1921 г. пад націскам ПАЗШ на Вашынгтонскай канфэрэнцыі.

Але ўсё гэтыя пытаньні мацуць [illegible] на пытаньні аб Кітаі ангельскі імпэрыялізм прабаваў выкарыстаць для таго, каб ажыцьцяўляць свае зьніжэньне з імпэрыялістычнай Японіяй. Ажыцьцяўленьне гэтай палітыкі натыкаецца на вялікія перашкоды ў самой Англіі, паколькі Аўстралія, Канада, Новая Зэляндыя выступаюць супроць саюзу з Японіяй. Тым ня менш міністар замежных спраў Саймон выступіў у Жэнэве ў часе абгаварэньня дакладу Літона, як адвакат японскага імпэрыялізму.

4. Новае вялікае абвастрэньне ва ўзаемаадносінах паміж Англіяй і ПАЗШ унесла Оттаўская канфэрэнцыя. Спроба ангельскага імпэрыялізму мацней зьвязаць імпэрскае адзіньства, увядзеньне сыстэмы імпэрскай пераваг, якая ажыцьцяўляецца цаною вялікіх ахвяр з боку ангельскага імпэрыялізму, увядзеньне пераважных мытаў для ангельскіх тавараў у Канадзе, Аўстраліі, Паўднёвай Афрыцы, Новай Зэляндыі, а таксама ў Індыі, прадастаўленьне квантынгентаў па ўвозе с.-г. тавараў у Англію брытанскім дамініёнам нанесьлі ўдар амэрыканскаму вывазу, затрудніілі барацьбу ПАЗШ за замежныя рынкі. Вось чаму ноты ПАЗШ Англіі пазрэсьлівяюць, што ўрэгуляваньне пытаньня аб даўгох залежыць ад пашырэньня рынкаў для сельскай гаспадаркі і прамысловасьці ПАЗШ.

5. Нясумненна, што праблема ўзбраеньня, пастаўленая ва ўвесь рост Жэнэўскай канфэрэнцыяй, таксама абвастрыла супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Англіяй.

Супярэчнасьці паміж Францыяй і Злучанымі Штатамі носяць іншы, менш востры характар, чым канфлікт паміж ПАЗШ і Англіяй. Калі барацьба паміж Англіяй і ПАЗШ ёсьць барацьба паміж дзьвюма буйнейшымі імпэрыялістычнымі дракапінкамі за ўладаньне сьветам, то пытаньні, вакол якіх французкія і амэрыканскія імпэрыялісты вядуць барацьбу, зьяўляюцца не настолькі ўсеагульнымі і ўсеабхопнымі з пункту гледжаньня ўзаемаадносін імпэрыялістычных дзяржаў. Паміж Францыяй і Злучанымі Штатамі ішла і ідзе барацьба за золата, і французкія атаці на курс даляра, па заяве Гувэра, ледзь не сарвалі ўжо ўстойлівасьць даляра.

Нясумненна, што ПАЗШ супраціўляюцца імкненьню французкага імпэрыялізму да гегемоніі на эўрапейскім кантынэнце. Паколькі ПАЗШ маюць буйнейшыя эканамічныя інтарэсы ў Германіі, яны супраціўляюцца далейшаму эканамічнаму і палітычнаму пашырэньню Германіі гегемоніі французкага імпэрыялізму. Калі французкі імпэрыялізм зьяўляецца найбольш ярым абаронцам вэрсальскай сыстэмы, міжнародным не жандарам на Захадзе, то ПАЗШ былі-б не ад таго, каб пашырыць Германію ў яе прэтэнзіях на перагляд усходніх границ, хаця ўсе гэтыя пытаньні могуць стаць у руках амэрыканскага імпэрыялізму разьменнай манэтай. Бясспрэчна, што вялікае абвастрэньне ва ўзаемаадносінах ПАЗШ і Францыі было ўнесена цяжкапінскай праблемай. **Французкі імпэрыялізм падтрымліваў і падтрымлівае японскі імпэрыялізм у захопе Манчжурыі, і Парыж знаходзіцца ў фактычным ваенна-палітычным саюзе з Токіё.**

Вострыя разгалосьці існуюць паміж Францыяй і ПАЗШ і па пытаньні аб узбраеньнях. У той час, як фінансавы капітал ПАЗШ імкнецца да скарачэньня ваенных выдаткаў эўрапейскіх краін, каб забясьпечыць аплату дзяржаўных і прыватных даўгоў эўрапейскіх краін Злучаным штатам, французкі імпэрыялізм ня зьбіраецца скарачаць сваіх узбраеньняў.

Далейшыя ўскладненьні былі ўнесены ва ўзаемаадносінах паміж Францыяй і ПАЗШ у разультаце Лёзанскай канфэрэнцыі. Як вядома, у часе Лёзанскай канфэрэнцыі Англія, Францыя і рад іншых эўрапейскіх дзяржаў заключылі славутую «джэнтльменскую згоду» аб тым, што ўрэгуляваньне рэпарацыйнага пытаньня ўступае ў моц толькі ў тым выпадку, калі Злучаныя Штаты вызваляць сваіх эўрапейскіх даўжнікоў ад плацяжоў па ваенных даўгох. У гэтай «джэнтльменскай згодзе», якая отварыла ўмову паміж рэпарацыйнымі плацяжамі і ваеннымі даўгамі, Злучаныя Штаты ўбачылі спробу стварэньня эўрапэйскага адзінага фронту супроць ПАЗШ па пытаньні аб даўгох. У часе Лёзанскай канфэрэнцыі Англія і Францыя заключылі славуты «пакт аб давер'і», у якім яны абавязаліся ўзгадняць свае выступленьні па пытаньнях, вырашаных на Лёзанскай канфэрэнцыі, а таксама па пытаньнях, якія пагражаюць абгаварэньню на Жэнэўскай канфэрэнцыі. У гэтым пакце аб давер'і Злучаныя Штаты ўбачылі **сур'ёзны крок да аднаўленьня англа-французкай антанты на новых пачатках, з новым зьместам,** прычым Вашынгтон не без падставы падазраваў, што англа-французкае збліжэньне накіравана і супроць ПАЗШ.

Ня гледзячы на пазяўленьне гэтых разгалосьцяў, супярэчнасьці паміж Францыяй і ПАЗШ, як бы яны рэальныя ня былі, зусім ня носяць такога глыбокага характару, як супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Англіяй, і зусім не выключаюць згоды паміж абедзьма краінамі. Падтрыманьне японскага імпэрыялізму Кітай нацый, гэта значыць французкім і ангельскім імпэрыялізмам, «джэнтльменская згода», заключаная ў Лёзане, г. зн. спроба да стварэньня адзінага эўрапейскага блёку супроць ПАЗШ, лёзанскі пакт аб давер'і, г. зн. збліжэньне паміж Англіяй і Францыяй, шчыльнае супрацоўніцтва паміж французкім і японскім імпэрыялізмам, збліжэньне паміж Англіяй і Японіяй,—прымусілі Злучаныя Штаты папрабаваць разстроіць намечаную перагрупоўку сілаў, якія на Антлянтычным і на Ціхім акіянах стварылі вяспрыяючую, з пункту гледжаньня ПАЗШ, камбінацыю. Перагаворы амэрыканскага сэнатара Рыда і амэрыканскага пасла Дэвіса ў Лёндане і Парыжы ідзі мэтай адкалоць або Англію або Францыю ад Японіі, расстрэіць збліжэньне паміж Англіяй і Францыяй.

Усе спробы скончыліся відавочна няўдачаю. Пасьля няўдачы гэтых спроб пасьледвала адмаўленьне ПАЗШ ад адтэрміноўваньня і перагляду дагаворэў па ваенных даўгох. Імпэрыялізм даляра папрабуе пашырэсьці перагаворы з эўрапейскімі дзяржавамі ў паасобку і вымусіць іх у паасобку да палітычных і эканамічных уступак. Можна не сумняваецца, што Злучаныя Штаты папрабуюць вырваць уступкі па пытаньні аб Кітаі, па пытаньні аб узбраеньнях і паўрад ці можна сумняваецца ў тым, што яны папрабуюць нанесьці ўдар і оттаўскай згодзе.

Зараз цяжка прадракаць, як скончыцца гэта барацьба, але бясспрэчна, што **закол пытаньня аб ваенных даўгох завязваецца вузел вострых імпэрыялістычных супярэчнасьцяй.** Ангельскі ўрад прыгразіў ужо ў сваёй другой ноце ня толькі катастрафічнымі вынікамі сьнежаньскіх плацяжоў для сусьветнай гаспадаркі наогул, але і вельмі рэальнымі контр-мерамі, **накіраванымі супроць ПАЗШ.** Ангельскі імпэрыялізм ужо выкарыстаў абмеркаваньне дакладу Літона ў Жэнэве для таго, **каб адкрыта стаць на бок японскага імпэрыялізму.** Англія і Францыя аб

ТЭХМІНІМУМ—КОЖНАМУ РАБОЧАМУ

XVII партканферэнцыя вызначыла асноўнай гаспадарчай задачай другой пяцігодкі завяршэнне тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. Гэта значыць, што на працягу другой пяцігодкі «нам трэба тэхнічна перабудаваць усю нашу народную гаспадарку ня толькі ўзышоўшы яе на ўзровень, дасягнуты ўжо ў перадавых па тэхніцы капіталістычных краінах, але і значна перавысіць сучасныя тэхнічныя дасягненьні гэтых краін» (Молатаў «Да тэхнічнай пяцігодкі»).

Стварэньне матар'яльнай базы і завяршэньне тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі ў другой пяцігодцы з усёй неабходнасьцю патрабуюць поўнай ліквідацыі тэхнічнай неграмотнасьці, аўладаньня тэхнікай свае справы, свайго варштату кожным рабочым і на гэтай аснове максымальнага ўзьнёсьця прадукцыйнасьці працы.

Разрыў паміж узрастаючымі патрабаваньнямі прамысловасьці і паяўнай тэхнічнай падрыхтоўкай рабочай сілы тлумачыцца тым, што за апошнія 2—3 гады ў нашы прадпрыемствы ўлілася і ўліваецца вялізарная колькасьць новых рабочых, якія ніколі раней не працавалі на фабрыках і заводах.

Гэты разрыў адчуваецца і ў прамысловасьці БССР і асабліва па вядучых галінах (машынабудаўніцтва, торф, экстра-гаспадарка, хімія і будаўнічыя матар'ялы), якія на сучасьці створаны нашава пасьля Кастрычніка і ня маюць аправеднага кадру старых кваліфікаваных рабочых.

Перад гаспадарчымі, савецкімі і прафсаюзнымі арганізацыямі стаіць баявая і неадкладная задача: забясьпечыць кожнаму рабочаму магчымасьць аўладаць мінімумам канкрэтных тэхнічных ведаў, якія зьяўляюцца рашаючымі для выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну, ацэнчуць шырокія масы рабочых, інжынэраў і тэхнікаў, адміністрацыйна - гаспадарчы персанал прадпрыемстваў у барацьбу за бальшавіцкае аўладаньне тэхнікай.

У гэтых мэтах савет працы і абароны СССР у пастанове ад 30 чэрвеня г. г. увёў абавязковы тэхнічны мінімум ведаў для рабочых, якія абслугоўваюць складаныя апараты, устаноўкі і маханізмы, або выконваюць іншыя, больш адказныя або небясьпечныя работы. У гэтай пастанове адзначана, што: «Усе пасады, якія зьвязаны з выкананьнем гэтых работ, пасьля вызначанага тэрміну могуць замяшчацца толькі рабочымі, якія аўладалі вызначаным мінімум тэхнічных ведаў і маюць аб гэтым адпаведныя пасьведчаньні».

Што-ж такое тэхнічны мінімум і ў чым практычнае значэньне яго ўвядзеньня?

«Тэхнічны мінімум павінен вызначаць пералік спэцыяльна-тэхнічных і палітычных ведаў і практычных звычак, неабходных для заняцьця данай пасады. Тэхнічны мінімум павінен абавязкова ўключыць усе неабходныя веды тэхнікі бясьпечнасьці (з пастановы СНА).

Такім чынам тэхнічны мінімум, як абавязковая форма тэхнічнай асьветы рабочага, уключае ў сябе суму тэхнічных і палітычных ведаў, неабходных рабочаму для сьвядомага і правільнага выкананьня вытворчых функцый на канкрэтным рабочым месцы.

Разам з тым тэхнічны мінімум павінен даць рабочаму разуменьне тых задач, якія стаяць перад цэхам, заводам і ўсёй рабочай клясай СССР, і на гэтай аснове мабілізаваць рабочую масу на барацьбу за выкананьне і перавыкананьне тэхпрамфінпляну, за ліквідацыю прарываў і тэхнічных непаладак у вытворчасьці, за прэцызнае планаваньне вытворчасьці і рацыяналізацыю яе, за сыстэматычнае ўкараненьне навейшых дасягненьняў навукі і тэхнікі, за эканамічную незалежнасьць СССР.

Увядзеньне тэхмінімуму і ліквідацыя тэхнічнай неграмотнасьці надзвычай складаная і цяжкая задача. Гэта гаворыць аб тым, наколькі вялікую ўвагу павінны зьвярнуць партыйныя, савецкія, гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі на справу ўвядзеньня абавязковага тэхнічнага мінімуму.

Якія-ж практычныя задачы ў справе ўвядзеньня тэхмінімуму стаяць перад намі на пароге новага гаспадарчага году і ўступленьня ў другую пяцігодку?

Першачарговай і неадкладнай задачай партыйных калектываў, заводаў, адміністрацый прадпрыемстваў і асабліва новага фабрычна-заводзкага друку зьвяцца шырокая папулярызацыя значэньня тэхмінімуму, скарыстаўшы для гэтага ўсе формы масавай палітычнай работы. Мы павінны дабіцца таго, каб кожны рабочы разумеў усю важнасьць увядзеньня тэхмінімуму і свой канкретны ўдзел у гэтай рабоце.

Разам з тым трэба рашуча ўдарыць па апартуністычнай недаацэнцы тэхнічнай прапаганды наогул і ўвядзеньня тэхнічнага мінімуму ў прыватнасьці, пасобнымі гаспадарнікамі, прафесыянальнымі і інш. арганізацыямі. Ход папярэдняй падрыхтоўкі да ўвядзеньня тэхмінімуму па прадпрыемствах упаўнаважанымі і інш. гаспадарчых наркаматах выявіў ужо цэлы рад фактаў гэтай недаацэнкі і простага ігнараваньня дырэктыў партыі і ўраду па гэтым пытаньні.

У справе папулярызацыі тэхмінімуму трэба максымальна выкарыстаць конкурс прадпрыемстваў, ВТНУ і аб'яднаньняў, абвешчаны тэхпропам упаўнаважанымі на лепшую падрыхтоўку да ўвядзеньня тэхмінімуму. Праз нізавы друк, радыё, масавыя формы палітычнай і тэхнічнай прапаганды трэба прыцягнуць да ўдзелу ў конкурсе кожнае прадпрыемства, цэх, брыгаду, кожнага рабочага пасобку.

Адпачасова з папулярызацыяй тэхмінімуму, партколектывы, гаспадарнікі і прафарганізацыі павінны забясьпечыць вылучэньне на работу па тэхпрапагандзе лепшых рабочых ударнікаў, прыцягненьне да работы тэхпропаў, інжынэрна - тэхнічных работнікаў, складаньне матар'яльнай і фінансавай базы для тэхнічнай вучобы і максымальнае ўмацаваньне нізавога зьвяна-тэхпропу.

Ужо ў 1933 годзе неабходна ўвесьці тэхмінімум па ряду вядучых прафесій і спэцыяльнасьцей, пералік якіх зацьвердзіў і апублікаваў Наркамцяжпрамам СССР.

У БССР у 1933 годзе тэхмінімумам павінны быць ахоплены 10—15 проц. усіх рабочых, якія падлягаюць абавязковаму тэхнічнаму навучаньню.

Неабходна арганізаваць камплектаваньне навучальнай сеткі рабочымі слухачамі, кіраўнікамі гурткоў і кіраўнікамі вытворчага інструктажу, арганізаваць мэтадычную падрыхтоўку і спэцыяльныя семінары.

На кожным заводзе неабходна правесьці мэтадычную падрыхтоўку да ўвядзеньня тэхмінімуму: складзьці вытворчыя характарыстыкі і нормы патрабаваньняў па тэхмінімуму на кожнае рабочае месца і на аснове гэтага давесьці тыповыя праграмы тэхмінімуму да кожнага рабочага месца, наладзіць работу мэтадычных бюро і кансультацыйных пунктаў пры тэхпропах і інш.

Асобна трэба падрэсьліць важнасьць пад рыхтоўчай работы ў напрамку стварэньня неабходных умоў для вучобы ў гуртках тэхмінімуму, забясьпячэньня гурткоў памяшканьнем, літаратурай і дапаможнымі матар'ялам, а таксама вызначэньня ў заводзкіх календарох спэцыяльных дзён для тэхмінімуму, вызваліўшы гэтыя дні ад усякай іншай грамадзкай работы.

Задачы аўладаньня тэхнікай паспул, правядзеньня абавязковага тэхмінімуму ў прыватнасьці, могуць быць пасьпяхова выкананы тэмпы пры максымальным удзеле самых шырокіх мас рабочых і ІТР у барацьбе за ўсеагульную тэхнічную пісьменнасьць. Партыйныя і прафесыянальныя арганізацыі павінны забясьпечыць стварэньне на кожным прадпрыемстве тэхнічнай грамадзкасьці пытаньнем арганізацыі і сыстэматычнага кіраўніцтва яч. «ЗАТ» і «НТО». і ўцягненьня праз гэтыя ячэйкі тэхмінімуму ахвяру прадпрыемстваў да пераскрэтнай работы па ўвядзеньні тэхмінімуму.

Асабліва вялікую ролю ў гэтай рабоце змогуць адыграць навукова-дасьледчы інстытут прамысловасьці і ВТНУ. Яны павінны стаць апорнымі базамі прадпрыемстваў і аб'яднаньняў у распрацоўцы прыкладных праграм у падрыхтоўцы да выкананьня рабочых справаднікаў па тэхмінімуму і па ўсёй рабоце метадычных бюро на прадпрыемствах. Студэнты апошніх курсаў ВТНУ павінны быць выкарыстаны ў якасьці кіраўнікоў гурткоў. Парт'ячэйкам і прафкомам гэтых устаноў трэба мабілізаваць свае калектывы і зьвязацца з адпаведнымі прадпрыемствамі для канкрэтнай дапамогі.

Навукова-тэхнічнаму выдавецтву Белрадыёцэнтру, Белдзяржкіно, Дзяржаўнай бібліятэцы трэба перабудаваць сваю работу так, каб сыстэматычна і без перабояў забясьпечваць прадпрыемствы неабходным дапаможным матар'ялам для заняткаў гурткоў тэхнікуму.

У заключэньне неабходна адзначыць, што барацьба за аўладаньне тэхнікай, за лутчэйшую мікідацыю тэхнічнай пісьменнасьці — адзін з адказнейшых вучасткаў абвостранай клясавай барацьбы. Клясавы вораг праяўляе сваю дзейнасьць і на гэтым фронце. Ён імкнецца перашкодзіць партыі і рабочай клясе ў справе аўладаньня тэхнікай.

Таму на гэтым вучастку партарганізацыя павінна праявіць асаблівую клясавую чуласьць і павесьці рашучую барацьбу з адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі ў пытаньнях тэхнічнай палітыкі і тэхнічнай прапаганды.

Неабходна абвясьціць рашучую барацьбу з правааапартуністычнай недаацэнкай тэхпрапаганды, з праяўленьнямі вузка тэхнічнага і выпустошваньня палітычнага зьместу ў рабоце тэхпропаў, за ўвязку тэхнічнай прапаганды з канкрэтнымі задачамі барацьбы за выкананьне тэхпрамфінпляну.

Ня можа быць сумненьня, што і на тэхнічным фронце бальшавікі дабіваюцца такіх-жа посьпехай, як і на ўсіх вучастках сацыялістычнага буداўніцтва. Шляхам сацспаборніцтва і ўдарніцтва, з дапамогаю шырокага грамадзкага руху за тэхмінімум мы дабіемся ўсеагульнай тэхнічнай пісьменнасьці рабочых.

САКАЛОЎСКІ.

Дадатковыя ільготы па аднаразовым падатку

Аднаразовы падатак з аднаасобнікаў зьяўляецца вострай зброяй у руках партыі і ўраду па выраўнаньні чарговых задач на вёсцы.

Сацыялістычны сэктар — саўгасы і калгасы — акуратна выконвае свае абавязкі перад дзяржавай як па выкананьні пляну загатовак, так і па грашовых плацяжох. Аднаасобны сэктар значна адстае, у выніку чаго Беларуская ССР да гэтага часу ня выканала пляну дзяржаўных загатовак.

Побач з асобнымі гаспадаркамі, якія злосна ня выконваюць пляну, ёсьць шмат гаспадарак, якія акуратна, добрасумленна (поўнасьцю і ў вызначаны тэрмін) выканалі свае абавязкі перад дзяржавай.

√Законам пра аднаразовы падатак прадастаўлена права рабінным выканаўчым камітэтам вызваляць поўнасьцю і часткова ад аднаразовага падатку асобныя гаспадаркі, якія акуратна выканалі свае пляны па грашовых плацяжох і дзяржаўных загатоўках. √

Побач з гэтым, гаспадаркам, якія злосна ня выконваюць дзяржаўных заданьняў па загатоўках, закон дазваляе павышаць стаўкі аднаразовага падатку аж да падвойнага разьмеру, што не вызваляе гэтых гаспадарак ад выкананьня пляну дзяржаўных загатовак.

√ Урад БССР устанавіў, што **ільготу па аднаразовым падатку (частковае ці поўнае вызваленьне)** маюць права атрымаць аднаасобныя гаспадаркі, якія акуратна выканалі свае абавязкі перад дзяржавай.

Устаноўленая ўрадам БССР дадатковая ільгота па аднаразовым падатку мае буйнейшае значэньне. Задача раённых арганізацый і мясцовага друку заключаецца ў тым, каб забясьпечыць давядзеньне гэтай ільготы да ведама кожнай працоўнай аднаасобнай гаспадаркі, шырока яе папулярызуючы.

Дадатковая ільгота павінна ўсамерна спрыяйнічаць паскарэньню тэмпаў выкананьня пляну дзяржаўных загатовак і грашовых плацяжоў.

Працоўнае сялянства павінна ўлічыць важнасьць устаноўленых ільгот па аднаразовым падатку, маючы на ўвазе тое, што **злосным зрыўшчыкам дзяржаўных загатовак стаўка аднаразовага падатку можа быць павышана да падвойнага разьмеру і адначасова гэта не вызваляе іх ад выкананьня пляну загатовак.**

Акуратна выканаўшыя свае абавязкі перад дзяржавай гаспадаркі павінны атрымаць устаноўленыя законам ільготы бяз усякай цяганіны.

В. ЛЯХАЎ.

Інстытут фізіятраніі ў Менску.

Вылазка клясавага ворага на ф-цы „Кім"

Пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб пашырэньні правоў заводакіраўніцтва ў справе забясьпячэньня рабочых, як і папярэдняя пастанова аб прагулах, знайшла дружны водгук з боку ўсёй пралетарскай грамадзкасьці. Працоўныя сацыялістычных прадпрыемстваў адказалі на ўрадавыя пастановы ўзмацненьнем працоўнай дысцыпліны, узмацненьнем барацьбы за пераможнае завяршэньне пляну? чацьвертага заключнага году першай пяцігодкі.

З другога боку, клясава-варожы элемэнт узмацніў сваю актыўнасьць, накіраваную на дэзарганізацыю нашай сацыялістычнай вытворчасьці. Клясавы вораг скарыстоўвае нашы слабыя месцы, пасобныя хібы і памылкі ў рабоце для сваёй клясава-варожай мэты — зрыву сацыялістычнага буداўніцтва.

Адкрытае выступленьне клясавага ворага з мэтай зрыву працоўнай дысцыпліны мела месца на **панчошнай фабрыцы імя КІМ** (Віцебск).

З 9 на 10 сьнежня выключна з-за безгаспадарчасьці кіраўніцтва сталовай 12 рабочым фармовачнага цэху групы «А», якія працавалі на трэцяй зьмене, не хапіла абеду. Безадказнасьць і безгаспадарчасьць, якую праявіла кіраўніцтва сталовай, выклікалі зусім правільнае абурэньне рабочых.

Пралезшая на фабрыку падкулачніца **Старчанка** скарыстала незадаваленьне работніц для сваіх клясава-варожых мэтаў і накіравала яго на зрыў вытворчай праграмы. Ня выходзячы з цэху, яна першая дэманстрацыйна пакінула работу і праз агітацыю дабілася таго, што астатнія работніцы таксама кінулі работу, застаўшыся, як і Старчанка, у цэху.

Камсамольцы, якія працавалі на гэтай зьмене, страцілі сваю клясавую чуйнасьць. Замест таго, каб быць у першых радох барацьбітоў за прамфінпляц, яны апынуліся сярод дэзарганізатараў сацыялістычнай вытворчасьці. Сярод групы пакінуўшых работу былі камсамолкі **Сапеева, Янчанка і Казакова.** Камсамолка **Бялевіч,** якая не пакінула працы, падбухторвала іншых не працаваць.

Поўную бязьдзейнасьць праявілі дзяжурны дырэктар па фабрыцы, член партыі, **Баброў** і загадчык зьмены, кандыдат партыі, **Іванова.** Замест таго, каб скарыстаць свае правы адміністратараў — загадаць стаць па работу і адначасова прыняць меры да забясьпячэньня рабочых прадуктамі, для чаго была поўная магчымасьць (на тэрыторыі фабрыкі жывуць загадчык сталовай і старэйшы кухар, прадукты былі ў выстарчальнай колькасьці), яны адыгралі ролю пасыўных сузіральнікаў.

Пралетарская грамадзкасьць фабрыкі рэагавала на факт вылазкі клясавага ворага. Па партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай лініі былі праведзены сходы ва ўсіх цэхах. Рабочы калектыў фабрыкі аднадушна асудзіў шкодны ўчынак групы работніц зьмены «А», поўнасьцю выкрыў кулацкі твар **Старчанкі,** патрабаваўшы звальненьня яе і іншых ініцыятараў гэтай справы з прадпрыемства. Пастановай бюро партколектыву дзяжурны дырэктар фабрыкі **Баброў** і загадчык зьмены **Іванова** атрымалі вымову. Бюро ячэйкі ЛКСМ камсамолкі **Бялевіч, Сапееву і Янчанка** выключыла з камсамолу. **Казакова** атрымала суровую вымову. Пастановай фабкому **Старчанка** і інш. выключаны з членаў прафсаюзу.

Адміністрацыя фабрыкі, за выключэньнем звальненьня з прадпрыемства Старчанкі, ніякіх мер спагнаньня да іншых работніц фабрыкі, пакінуўшых работу, не прыняла. Яна таксама абышла маўчаньнем і не прынягнула да адказнасьці **Баброва** і **Іванову.** І толькі пасьля ўказаньняў з боку бюро партколектыву, праз некалькі дзён, адміністрацыя абвясьціла дзяжурнаму дырэктару і загадчыку зьмены вымову. Трэст грамадзкага харчаваньня ніякіх мер да кіраўніцтва сталовай, якія непадбайна аднесьліся да сваіх абавязкаў, ня прыняў.

***

У часе абгаварэньня пастановы пра пашырэньне правоў заводакіраўніцтва ў справе снабжэньня рабочых, якая была аднадушна ўхвалена ўсім рабочым калектывам фабрыкі, выступаўшыя работніцы яшчэ раз падкрэсьлілі дрэнную работу сталоўкі і ЗРК. Кіраўніцтва сталовай ігнаравала самазагатоўкі, у выніку чаго сталовая не забясьпечана па зіму прадуктамі. Спэкулянцыя ў буфэце, разбазарваньне хлеба — частыя зьявішчы ў сталовай. Трэст грамадзкага харчаваньня ніякай дапамогі сталовай не аказаў. ЗРК таксама не перабудавае сваёй работы. Ён нават ня здолеў забясьпечыць рабочых гародніной, самазагатоўкі былі ў ЗРК на апошнім пляне. У новае праўленьне ЗРК, якое выбіраецца гэтымі днямі, рабочыя вылучаюць сваіх лепшых ударнікаў.

Арк. Зарубежны.

Л. Мад'яр

Даўгавы вузел імпэрыялістычных супярэчнасьцяй

Не падлягае найменшаму сумненьню, што адмаўленьне ПАЗШ адтэрміноваць сьнежаньскія плацяжы па ваенных даўгох паставіла Англію і Францыю ў фінансавых адносінах у вельмі цяжкое становішча. Сьнежаньскі ўзнос, які Англія павінна была зрабіць Злучаным Штатам, складае 93 млн. даляраў. Адпак, у той-жа час ангельскаму казначэйству прыходзіцца заплаціць каля 80 млн. даляраў за выкуп тых дзяржаўных аблігацый, замежныя ўласьнікі якіх не згадзіліся на канвэрсію па найбольш нізкім пропанце. Ангельскае казначэйства, такім чынам, стаіць перад задачай перавесьці каля 173 млн. даляраў за граніцу.

Акрамя таго, прадстаіць яшчэ плацяжы па даўгох, заключаных па стабілізацыі фунта стэрлінгаў у 1931 г. Гэтыя моманты даюць тлумачэньне рэзкага зьніжэньня курсу фунта стэрлінгаў. Гэтымі-ж момантамі тлумачыцца і тое, што ў лягеры ангельскай фінансавай алігархіі разгарэлася вострэйшая барацьба па пытаньні аб тым, плаціць ці не. Унясэньне сьнежаньскіх плацяжоў азначае далейшае абясцэненьне фунта стэрлінгаў.

Але ці можа Англія, якая займае ўсё яшчэ другое месца па сусьветным грашовым рынку, а ў галіне фінансаваньня замежнага гандлю, судахоўства, страхаваньня першае месца, абвясьціць сябе неплатаздольнай? Ці можа Англія, якая мае замежныя капіталаўкладаньні ў разьмеры 4 млрд. фунтаў стэрлінгаў, значыць каля 40 млрд. рублёў золатам, абвясьціць сябе неплатаздольнай і тым самым падаць небясьпечны прыклад сваім уласным даўжнікам? Ці можа ангельскі ўрад, які мае ўнутраную запазычанасьць у разьмеры 7,4 млрд., абвясьціць сябе неплатаздольным і тым самым напосьці непаправны ўдар усёй сусьветнай крэдытнай сыстэме — прыцыпу сьвятасьці дагаворэў?

З другога боку, бясспрэчна, што ўнясэньне плацяжоў па даўгох заўсёды называлі абвастрае і без таго крытычнае становішча ангельскага бюджэту.

Весь чаму ангельскі ўрад так упарта змагаўся за адтэрмінованьне плацяжоў. Але імянна таму ўрад ПАЗШ адхіліў усе ангельскія ноты, усе ангельскія аговоркі. Некаторыя думалі, што міжпарэньня банкіры ў ПАЗШ запікаўлены ў ануляваньні ваенных даўгоў і будуць аказваць націск на Гувэра ў гэтым сэнсе для таго, каб забясьпечыць плацяжы па прыватных і камэрцыйных даўгох. Справа аднак, у тым, што праблема даўгоў даўно перастала быць эканамічнай праблемай, **што яна ўвязана з пытаньнем аб Манчжурыі, аб узбраеньнях, аб разьмеркаваньні золата, аб перадачы рынкаў, калёній і г. д.** Імянна таму ангельскі ўрад скарыстаў пытаньне аб даўгох для ўзмацненьня англа-французскага супраціўніцтва. Адхіляючы і разьбіваючы ўсе спробы ПАЗШ разьяднаць Англію і Францыю, Лёндан дэманстраваў адзіны фронт паміж Англіяй і Францыяй. А ПАЗШ якраз дабіваліся расколу англа-французскага блёку.

Для Францыі праблема ваенных даўгоў, з пункту гледжаньня фінансавага, прадстаўляе меншыя труднасьці. Францыя, маючы вялікія залатыя запасы магла-б вывезьці 19 млн. даляраў, якія яна павінна заплаціць Злучаным Штатам. Адпак, французкі імпэрыялізм да гэтага часу абараняў той пункт гледжаньня, што Францыя будзе плаціць па міжсаюзьніцкіх ваенных даўгох толькі ў тым выпадку, калі яна атрымае рэпарацыі ад Германіі. Германія ня плаціць рэпарацый. Любы французкі ўрад, які-б спрабаваў унесьці плацяжы па ваенных даўгох, не атрымліваючы рэпарацыйных даўгоў ад Германіі, рызыкаваў-бы правалам у французкім парляманце. Французкая палата дэпутатаў у цяперашнім сваім складзе наўрад ці згадзілася-б на такі крок.

Усл праблема ваенных даўгоў ускладняецца яшчэ тым, што Бэльгія і Польшча адмовіліся плаціць, лічачы за лепшае абвяшчэньне адкрытага банкрутства.

Праблема ваенных даўгоў складае частку ўсёй вэрсальскай сыстэмы. У рэзультаце вайны паміж эўрапэйскімі краінамі цэлая піраміда даўгавых абавязальніцтваў, а на вярху яе сядзяць Злучаныя Штаты, якім заваёўваліся ў часе сусьветнай вайны ўсе эўрапэйскія дзяржавы. Базісам усёй гэтай сыстэмы міжнародных даўгавых абавязацельстваў служылі германскія рэпарацыйныя плацяжы. Ход сусьветнага эканамічнага крызісу і выбухнуўшы ўлетку 1931 году крахітны крызіс разбурылі гэты базіс.

З прычыны эканамічнага хаосу ў рэзультаце крызісу па заграніччы капіталаўкладаньняў, скарачэньня сусьветнага гандлю ўвесь будынак міжнародных плацяжных абавязацельстваў атрымаў цяжкі ўдар. **Амаль усе краіны Паўднёвай і Цэнтральнай Амэрыкі зьяўляюцца ўжо банкрутамі. Амаль усе балканскія краіны ўжо спынілі плацяжы па сваіх міжнародных даўгох, а ў Цэнтральнай Эўропе — Германія, Вэнгрыя, Аўстрыя ня ў стане выплачваць сваіх замежных даўгоў.** Гувэраўскі мараторый, абвешчаны на рэпарацыях і міжсаюзьніцкіх даўгох у ліпені 1931 г., затушаваў сапраўднае становішча рэчаў, адтэрміноваў выбух супярэчнасьцяй вакол пытаньня аб ваенных даўгох і рэпарацыях.

Але ўсё разьвіцьцё міжнародных адносін на працягу апошняга году ўнесла столькі абвастраньня, столькі ўскладненьняў ва ўзаемаадносіны імпэрыялістычных дзяржаў, што праблема ваенных даўгоў стала ў даны момант толькі фокусам, у якім адбываюцца ўсе супярэчнасьці імпэрыялістаў. **Вакол гэтага пытаньня стварыўся вузел супярэчнасьцяй, які зацягваецца ўсё тужэй і тужэй.** Гутарка ідзе ня толькі аб эканамічнай, але і аб глыбока-палітычнай праблеме.

Супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Англіяй зьяўляюцца вядучымі супярэчнасьцямі ў лягеры імпэрыялістаў. Яны, гэтыя супярэчнасьці, пранізваюць усе астатнія міжімпэрыялістычныя супярэчнасьці і накладаюць на іх свой адбітак. У найбольш яўнай форме гэтыя супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Англіяй праявіліся за мінулы год на наступных пытаньнях:

1. У Паўднёвай Амэрыцы жорсткая барацьба паміж ангельскім і амэрыканскім імпэрыялізмам вылілася ў цэлы рад дзяржаўных пераваротаў у розных краінах Паўднёвай і Цэнтральнай Амэрыкі. **Ангельскі імпэрыялізм прабаваў зьвергнуць у гэтых краінах урады, якія арыентаваліся на ПАЗШ, а амэрыканскі імпэрыялізм, са свайго боку, прабаваў зьвергнуць урады, якія арыентаваліся на Англію.** Вайна паміж Балівіяй і Парагваем была толькі формай праяўленьня барацьбы ня толькі паміж Стандар Ойль і Дэтэрынгам за нафту, але і паміж ангельскім і амэрыканскім імпэрыялізмам наогул. **Вайна паміж Калумбіяй і Пэру мае той-жа сэнс зьмест.**

2. Англія дабіваецца перарозьмеркаваньня залатых запасаў і не згаджаецца, ня гледзячы на націск ПАЗШ, стабілізаваць курс фунта стэрлінгаў, пакуль Злучаныя Штаты ня згодзяцца на больш «рэгулямернае» і спра вядлівае» разьмеркаваньне залатых запасаў. А ПАЗШ не жадаюць паступацца сваім золатам і ў сваёй другой ноце прапануюць перарозьмеркаваньне золата ў Эўропе.

3. Піхаўзіянская праблема ўносіць вялікае абвастраньне ў англа-амэрыканскія адносіны. Ангельскі імпэрыялізм, хаця і ў скрытай форме, падтрымліваў японскі імпэрыялізм у наступленьні на Кітай і ў захопе Манчжурыі для таго, каб заваяваць на свой бок Японію і якасьці саюзьніка ў барацьбе супроць ПАЗШ. Цэлы рад выдатных кансэрватараў на стойваў, што **ангельскі імпэрыялізм імкнецца да аднаўленьня англа-японскага ваенна-палітычнага саюзу,** скасаванага толькі ў 1921 г. пад націскам ПАЗШ на Вашынгтонскай канферэнцыі.

Абвастрэньне канфлікту паміж ПАЗШ і Японіяй па пытаньні аб Кітаі ангельскі імпэрыялізм прабаваў выкарыстаць для таго, каб ажыцьцяўляць свае зблізкіньне з імпэрыялістычнай Японіяй. Ажыцьцяўленьне гэтай палітыкі натыкаецца на вялікія перашкоды ў самой Англіі, паколькі Аўстралія, Канада, Новая Зэляндыя выступаюць супроць саюзу з Японіяй. Тым ня менш міністар замежных спраў Саймон выступіў у Жэнэве ў часе абгаварэньня дакладу Літона, як адвакат японскага імпэрыялізму.

4. Новае вялікае абвастрэньне ва ўзаемаадносінах паміж Англіяй і ПАЗШ унесла Оттаўская канфэрэнцыя. Спроба ангельскага імпэрыялізму мацней зьвязаць імпэрскае адзінства, увядзеньне сыстэмы імпэрскай пераваг, якая ажыцьцяўляецца цаною вялікіх ахвяр з боку ангельскага імпэрыялізму, увядзеньне пераважных мытаў для ангельскіх тавараў у Канадзе, Аўстраліі, Паўднёвай Афрыцы, Новай Зэляндыі, а таксама ў Індыі, прадастаўленьне кантынгентаў па ўвозе с.-г. тавараў у Англію брытанскім дамініёнам нанесьлі ўдар амэрыканскаму вывазу, затруднілі барацьбу ПАЗШ за замежныя рынкі. Вось чаму ноты ПАЗШ Англіі пазрэсьліваюць, што ўрэгуляваньне пытаньня аб даўгох залежыць ад пашырэньня рынкаў для сельскай гаспадаркі і прамысловасьці ПАЗШ.

5. Нясумненна, што праблема ўзбраеньня, пастаўленая ва ўвесь рост Жэнэўскай канфэрэнцыяй, таксама абвастрыла супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Англіяй.

Супярэчнасьці паміж Францыяй і Злучанымі Штатамі носяць іншы, менш востры характар, чым канфлікт паміж ПАЗШ і Англіяй. Калі барацьба паміж Англіяй і ПАЗШ ёсьць барацьба паміж зьвюма буйнейшымі імпэрыялістычнымі дзяржавамі за ўладаньне сьветам, то пытаньні, вакол якіх французкія і амэрыканскія імпэрыялісты вядуць барацьбу, зьяўляюцца не настолькі ўсеагульнымі і ўсеазначаючымі з пункту гледжаньня ўзаемаадносін імпэрыялістычных дзяржаў. Паміж Францыяй і Злучанымі Штатамі ішла і ідзе барацьба за золата, і французкія атаці на курс даляра, па заяве Гувэра, ледзь не сарвалі ўжо ўстойлівасьць даляра.

Нясумненна, што ПАЗШ супраціўляюцца імкненьню французкага імпэрыялізму да гегемоніі на эўрапэйскім кантынэнце. Паколькі ПАЗШ маюць буйнейшыя эканамічныя інтарэсы ў Германіі, яны супраціўляюцца далейшаму эканамічнаму і палітычнаму пашырэньню Германіі гегемоніі французкага імпэрыялізму. Калі французкі імпэрыялізм зьяўляецца найбольш ярым абаронцам вэрсальскай сыстэмы, міжнародным яе жандарам на Захадзе, то ПАЗШ былі-б не ад таго, каб патрымаць Германію ў ролі ўтэнэйных на перагляд усходніх границ, дзе ўсе гэтыя пытаньні могуць стаць у руках амэрыканскага імпэрыялізму разьменнай манэтай. Бясспрэчна, што вялікае абвастрэньне ва ўзаемаадносінах ПАЗШ і Францыі было ўнесена цэхаславацкай праблемай. **Французкі імпэрыялізм пад трымліваў і падтрымлівае японскі імпэрыялізм у захопе Манчжурыі, і Парыж знаходзіцца ў фактычным ваенна-палітычным саюзе з Токіё.**

Вострыя разгалосьці існуюць паміж Францыяй і ПАЗШ і па пытаньні аб узбраеньнях. У той час, як фінансавы капітал ПАЗШ імкнецца да скарачэньня ваенных выдаткаў эўрапэйскіх краін, каб забясьпечыць аплату дзяржаўных і прыватных даўгоў эўрапэйскіх краін Злучаным штатам, французкі імпэрыялізм ня зьбіраецца скарачаць сваіх узбраеньняў.

Далейшыя ўскладненьні былі ўнесены ва ўзаемаадносінах паміж Францыяй і ПАЗШ у рэзультаце Лёзанскай канфэрэнцыі. Як вядома, у часе Лёзанскай канфэрэнцыі Англія, Францыя і рад іншых эўрапэйскіх дзяржаў заключылі славутую «джэнтльмэнскую згоду» аб тым, што ўрэгуляваньне рэпарацыйнага пытаньня ўступае ў моц толькі ў тым выпадку, калі Злучаныя Штаты вызваляць сваіх эўрапэйскіх даўжнікоў ад пладжкоў па ваенных даўгох. У гэтай «джэнтльмэнскай згодзе», якая стварыла ўмову паміж рэпарацыйнымі плацяжамі і ваеннымі даўгамі, Злучаныя Штаты ўбачылі спробу стварэньня эўрапэйскага адзінага фронту супроць ПАЗШ па пытаньні аб даўгох. У часе Лёзанскай канфэрэнцыі Англія і Францыя заключылі славуты «пакт аб даверы», у якім яны абавязваліся ўзгадняць свае выступленьні па пытаньнях, вырашаных на Лёзанскай канфэрэнцыі, а таксама па пытаньнях, якія пакажуць абгаварэньню на Жэнэўскай канфэрэнцыі. У гэтым пакце аб даверы Злучаныя Штаты ўбачылі сур'ёзны крок да аднаўленьня англа-французскай антанты на новых пачатках, з новым зьместам, прычым Вашынгтон не без падставы падазраваў, што англа-французкае зблізкіньне накіравана і супроць ПАЗШ.

Ня гледзячы на пяўнасьць гэтых разгалосяў, супярэчнасьці паміж Францыяй і ПАЗШ, як бы яны рэальныя ня былі, зусім ня носяць такога глыбокага характару, як супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Англіяй, і зусім не выключаюць згоды паміж абедзьма краінамі. Падтрыманьне японскага імпэрыялізму Англіяй нацыі, гэта значыць французкім і ангельскім імпэрыялізмам, «джэнтльмэнская згода», заключаная ў Лёзане, г. зн. спроба да стварэньня адзінага эўрапэйскага блёку супроць ПАЗШ, лёзанскі пакт аб даверы, г. зн. зблізкіньне паміж Англіяй і Францыяй, цэльнае супраціўніцтва паміж французкім і японскім імпэрыялізмам, зблізкіньне паміж Англіяй і Японіяй,—прымусілі Злучаныя Штаты паправаць расстрэль намечаную перагрупоўку дзяржаў, якія на Антлянтычным і на Ціхім акіянах стварылі напрыяючую, з пункту гледжаньня ПАЗШ, камбінацыю. Перагаворы амэрыканскага сэнатара Рыда і амэрыканскага пасла Дэвіса ў Лёндане і Парыжы ішлі мэтай адкалоць або Англію або Францыю ад Японіі, расстрэіць зблізкіньне паміж Англіяй і Францыяй.

Усе спробы скончыліся відавочна няўдачаю. Пасьля няўдачы гэтых спроб пасьледвала адмаўленьне ПАЗШ ад адтэрмінованьня і перагляду дагаворэў па ваенных даўгох. Імпэрыялізм даляра напрабуе пішэ весьці перагаворы з эўрапэйскімі дзяржавамі ў пасобку і вымусіць іх у пасобку да палітычных і эканамічных уступак. Можна не сумняваца, што Злучаныя Штаты напрабуюць вырваць уступкі на пытаньні аб Кітаі, па пытаньні аб узбраеньнях і паўрад ці можна сумняваца ў тым, што яны напрабуюць нанесьці ўдар і оттаўскай згодзе.

Зараз пяжка прадракаць, як скончыцца гэта барацьба, але бясспрэчна, што **закол пытаньня аб ваенных даўгох завязваецца вузел вострых імпэрыялістычных супярэчнасьцяй.** Ангельскі ўрад прыгразіў ужо ў сваёй другой ноце ня толькі катастрафічнымі вынікамі сьнежаньскіх плацяжоў для сусьветнай гаспадаркі наогул, але і вельмі рэальнымі контр-мерамі, **накіраванымі супроць ПАЗШ.** Ангельскі імпэрыялізм ужо выкарыстаў абмеркаваньне дакладу Літона ў Жэнэве для таго, **каб адкрыта стаць на бок японскага імпэрыялізму.** Англія і Францыя абмяркоўваюць сумесна сваю тактыку супроць ПАЗШ і Макдональд выкрывае публічна спробы ПАЗШ, накіраваныя на расстройства зблізкіньня паміж Францыяй і Англіяй.

Ангельскі і французкі імпэрыялізм і іх ваенныя дзяржавы проста дэманструюць, што паміж імі існуе адзіны фронт супроць ПАЗШ. У той-жа час Італія самастойна пранесла ўнесьці сьнеж

ЗАХВАТ ШАНХАЙ-ГУАНЯ—ПЕРШЫ КРОК ДА ЗАХОПУ ПРАВІНЦЫІ ЖЭХЭ

ШАНХАЙ, 3. Як паведамляюць, у баёх за Шанхай-Гуань забіта некалькі японскіх салдат, адзін афіцэр і 14 кітайскіх салдат. Ранена шмат параненых. Японцы сьцьвярджаюць, што учора вечарам Чжан Сюэ-лянг вялікімі ўзьмацненьнямі з патрабаваньнем урэгулянаць інцыдэнт на працягу 24 гадзін. Кітайцы адмаўляюць атрыманьне ультыматуму.

Учора ўначы ў Бэйпіне адбылася нарада пры ўдзеле Чжан Сюэ-ляна, камандуючага Бэйпінскім гарнізонам, начальніка паліцыі і камандуючага жандарматэрыяй для выпрацоўкі мерапрыемстваў па абароне Бэйпіну і папярэджаньня магчымых узьнікненьняў мясцовых непарадкаў.

Згодна паведамленьням з афіцыяльных кітайскіх крыніц, 1 чысла японцы патрабавалі, каб цэлы кітайскі з Шанхай-Гуаня. Кітайцы адкінулі гэта патрабаваньне. 2 лыса японская авіяцыя пачала абстрэльваць Шанхай-Гуань. 30 лікрадаў і 10 авіябомб нанесьлі вялікую шкоду гораду. У поўдзень 2 чысла на японскім бронепацягіку пры была патрыманьне. Газэта «Чайна прэс» піша: «Японскія пляны аб захопе Паўночнага Кітаю пачалі ажыцьцяўляцца захопам станцыі Шанхай-Гуань. Як дзлёка ідуць намеры Токіё—невядома. Кітайскія паведамленьні ацэньваюць, што японцы маюць прасунуцца па Бэйпін-Шанхай-Гуаньскай чыгунцы аж да Цянь-Цзіну. Лічаць таксама, што захват Шанхай-Гуаня зьяўляецца першым крокам да захопу правінцыі Жэхэ. Вайсковыя апэрацыі ў Шанхай-Гуані маюць мэтай адцяжнуць частку кітайскіх войск з іх пазыцый каля Жэхэ.

У Нанкіне пыярэгулюць чуткі аб тым, што японцы маюць намер атакаваць іншыя пункты, прычым гэты план рэгулядаецца як вынік згоды аб пакоі Кітаю паміж Японіяй і іншымі дзяржавамі на ўмовах, прапанаваных пасьля Лікэрокага паўстаньня.

ПАЗШ БУДУЮЦЬ МАГУТНЫ ПАВЕТРАНЫ ФЛЁТ

Амэрыканскі ўрад, які нарабіў у Жэнэве столькі шуму праектам Гувера аб «разбраеньні», выносіць новую праграму ваенна-авіяцыйнага будаўніцтва. Рэалізаваньне гэтай праграмы пачнецца з 1 студзеня бягучага году і прадбачыць пабудову 228 самалётаў з сярэдняй лётнай хуткасьцю ў 350 клм. на гадзіну.

Начальнік дэпартамэнту авіяцыі заявіў, што новыя самалёты па сваёй магутнасьці і хуткасьці адпавядуць ня ўсталяваным існуючым вайсковым самалётам.

Сканцэнтраваныя выдаткі два тыпы самалётаў: прадстаўляюць сабой: адзін—цэльна-мэталёвы, здольны падняць двух чалавек, з хуткасьцю лёту ў 350 клм. на гадзіну, а другі—быстраходны бамбавоз.

Ваенная авіяцыя ПАЗШ на 1 верасьня, паводле афіцыяльных данных, налічвала 1.277 самалётаў. Тут зусім не ўспамінаецца аб грамадзянскім паветраным флёце, які налічвае значна больш адзінак рознага тыпу, чым ваенны паветраны флёт.

У Жэнэве—балбатня аб міры, у Вашынгтоне—узмоцненыя ўзбраеньні. («Юманітэ»).

УЗДЫМ ПАКАЗВАЕ ТОЛЬКІ СТАТЫСТЫКА САМАГУБСТВАУ

Сумныя вынікі 1932 г. у Польшчы

ВАРШАВА, 2. У сувязі з новым годам польскі друк падводзіць некаторыя вынікі палітычнага і эканамічнага становішча Польшчы. Асобна ўнутрыпалітычнага і эканамічнага становішча прасякнута духам крайняга песьпісму. Газэты канстатуюць скарачэньне прадукцыі ва ўсіх галінах у сярэднім на 35—40 проц. у параўнаньні з 1931 г. Рэнорны ўздым у параўнаньні з папярэднім годам паказвае толькі статыстыка самагубстваў. За 1932 г. 20 тыс. чалавек прабавалі пакончыць самагубствам.

Энцэнная «Газэта Варшаўска» піша аб ўсмажнаньні злачынальці ў вёсцы. «Пяцігадцаць вёсак, — піша газэта, — зьяўляюцца зараз пакражы. Нешчасныя асобы цягнуць усё: пугунак, авец, пасьцельныя прылады, вопратку, нават плодавы дрэвы. Вінаваты, як піпуць нам мясцовыя карэспандэнты, не злодзеі — прафесіянады, а беспрацоўныя».

Пагаршэньне настроі сярод буржуазіі выклікалі мерапрыемства накіраваныя калісь напады беспрацоўных на крамы і магазыны. Журнал «Эпоха» ў новагодняй нумары піша:

«Мы акружаны шматмільённай стыхіяй галечы, перапоўненай гораччу нянавісьці і духам бунту. Нас і нашы кладовыя, нашы кватэры, магазыны абаранае ад гэтай стыхіі фізычная сіла, — паліцыя і войска. Абаранімся ўсе мы: ня толькі ўласьнікі банкаў і магазынаў, але і гаспадары кватэр, а таксама тыя, якія проста маюць карчы».

Мінулы год «Эпоха» называе годам хаоса і агульнага разлажэньня.

«Год хаоса, непакою, усеагульных сударагаў у мэтах процідзеяньня, — піша «Эпоха», — год адзначаны мноствам гардзіевых вузлоў, з якіх ні адзін ня быў вырашан, год застою і разлажэньня, год, які зьдзекваўся над дзяржаўнымі мужамі, палітыкамі, дыпляматамі і эканамістамі, бо яны нічога не прадбачылі і нічога не змаглі выправіць. Словы аб «пляне» гучэлі іранічна. Слова «праграма» зьяўлялася часьцей за ўсё сінонімам блефу. Усе працэсы аказаліся памылковымі. Мэрэльны аўтарытэт ураду ўсюды аслабеў. Усе тыя, прызнаньнем і задачай якіх зьяўляецца захаваньне спакою, парадку і грамадзкай рэўнавагі, самі ахоплены трывогай, расчараваньнем. Ня ведаючы, што прыхуе заўтрашні дзень, яны ядуць блізарукую палітыку, разьлічаную на адзін дзень. Капіталісты сьвет перажыў новыя патрасеньні і заблытаўся ў такім перапляцьцё труднасьцяй, які можна лічыць яго канцом».

«Надзея на бязьмежную выпрымнасьць мас ня можа быць моцнай пазыцыяй у разьлічках капіталізму... Ніякая сіла не захавае такога «парадку», які нястомна пагрэбліва грамадзкія супярэчнасьці. Капіталізм, — піша ў заключэньне «Эпоха», стаў падобны да скарпіёна, які «вензая свае жэло в собственный хвост, умерщвляет себя».

Пад націскам мас

ВАРШАВА, 2. Газэты паведамляюць пастрабаваньні гераічнай забастоўкі трох тысяч тэкстыльшчыкаў «Шлёзарускай мануфактуры» у Азэрскае (Лодзінскі раён), якія змагаюцца супроць масавых звальненьняў. Дырэкцыя, прабуючы ламаць супраціўленьне забастоўшчыкаў, запяўных памяшканьне фабрыкі, забараніла сем'ям дастаўляць забастоўшчыкам харчаваньне. Тым ня менш рабочыя не пакінулі фабрыкі. З прычыны зморанасьці адна работніца-тэкстыльшчыца памерла. Вестка аб яе сьмерці ўсхвалявала рабочае насельніцтва гораду. Перад фабрыкай адбылася бурная дэманстрацыя, якая скончылася жорсткай схваткай з паліцыяй. Толькі пасьля гэтай дэманстрацыі дырэкцыя, улічваючы настрой мас, абяцяла аб спыненьні лёкауту і абавязалася пусьціць у ход фабрыку 10 студзеня.

Напады беспрацоўных на харчовыя магазыны

ВАРШАВА, 3. У сувязі з новым годам у радзе гарадоў Польшчы наўтарыліся дэманстрацыі і напады беспрацоўных на харчовыя магазыны. У Варшаве на Тэатральным пляцы, дзе зьмяшчаюцца шыкарныя рэстаны, беспрацоўныя разьбілі на тратуарах сьмярдзючую вадкасьць. Ва Львове адбылося некалькі вулічных дэманстрацый беспрацоўных. Паліцыя правяла арышты. Пасьля разгону дэманстрацыі беспрацоўных выбілі шыбы ў магазынах. Па горадзе распаўсюджваліся лістоўкі, якія заклікалі беспрацоўных забіраць сілай харчовыя прадукты.

Такія-ж лістоўкі распаўсюджваліся ў гор. Перамышлі (Львоўскае ваяводзтва). У мястэчку Яноў (Верхняя Сілезія) груба беспрацоўных напала на харчовую краму і захапіла вялікую колькасьць прадуктаў. Удзельнікі нападу арыштаваны. У Лодзі таксама адбыліся шматлюдныя дэманстрацыі беспрацоўных. Беспрацоўныя выбілі шыбы ў магазынах на вуліцы Нарутовіча. Як паведамляюць газэты, учора на 1-га ў Варшаве арыштавана больш 200 асоб па падазрэньні ў рэвалюцыйнай дзейнасьці. (ТАСС).

М. Шаньскі

Гераічная барацьба рабочых Белавескай Пушчы

(Ліст з Беластоку)

1 лістапада выбухнула забастоўка 4.000 рабочых, якія працуюць пры эксплёатацыі Белавескай Пушчы. Гэта ўжо другая забастоўка ў бягучым годзе ласных рабочых у Пушчы. Першая забастоўка адбылася ў лютым.

Забастоўка гэта працягваецца ўжо звыш 6 тыдняў. Гераічная барацьба ласных рабочых сьведчыць аб тым, што яны гатовы змагацца да задаваленьня патрэбнасьцю ўсіх іх патрабаваньняў, да поўнай перамогі.

Для рабочых Белавескай Пушчы мог быць толькі адзін выбар: або далей працаваць ад цямна-да-цямна за жабрачую зарплату 1-20—1-50 злотых у дзень, купляць сабе на гэ тыя грошы ашчэ прылады працы—сякеры, сякеры, восеньню таліцца па пояс ў балоце, зімой — у сьнезе і на марозе, без забесьпячэньня на выпадак хваробы і беспрацоўя, далей гнуць карк пад бізуном эксплёатараў, якая выкідвае рэвалюцыйных рабочых з працы, ня прымае на 10 і больш месяцаў усьцяж на работу тых рабочых, якія не жадаюць уступіць у рады фашысцкага «Отральца», або самому рэзарвістаў; або пачаць рашучую барацьбу за паляпшэньне свайго быту. Ня глядзячы на тое, што бастуючыя ўсё лета былі беспрацоўнымі, добра ведалі, што прыдзецца ім жорстка змагацца супроць фашысцкага тэрору і штрэйкбрахэрства—яны выбралі барацьбу.

Рабочыя Белавескай Пушчы пачалі барацьбу за аднаўленьне ставак з 1930 г., г. зн. за 1-20—1-50 злотых за куб. мэтр замест 60-80 грошай, якія плацілася да гэтага часу ў залежнасьці ад гатунку дрэва, за 8-гадзінны рабочы дзень, за забесьпячэньне на выпадак беспрацоўя і хваробы і за адмоўкавую аплату рабочых ва ўсіх раёнах Пушчы.

У першых числах сьнежня да забастоўкі далучыліся таксама рабочыя Гайнаўкі і Белавежы. З першых-жа дзён забастоўкі дырэкцыя Белавескай Пушчы застасавала вострыя сродкі для зламаньня забастоўкі. Барбарскі тэрор, штрэйкбрахэрства і зрада сацыял-фашысцкіх правадыроў—усё было пушчана ў рух для дасягненьня гэтай мэты.

Перад бастуючымі паўстала баявая задача—арганізаваць усіх бастуючых. Гэта задача была тым больш цяжкай, што бастуючыя раскінуты ў лесе на абшары каля 1.000 кв. кілёмэтраў.

Правадыры сацыял-фашысцкага прафсаюзу, бачачы, што ім ня ўдасца перашкодзіць выбуху забастоўкі і, разгрываючы з сябе абаронцаў рабочых, абвяшчаюць забастоўку. Але ўжо першапачатковая тактыка пэпэсэўцаў, якая заключалася ў тым, каб замоўчваць забастоўку, ізаляваць яе і такім чынам, палегчыць дырэкцыі і паліцыі задушыць забастоўку, паказала масам сапраўдныя намеры пэпэсэўскіх машэньнікаў. Славуты пэпэсэўскі машэньнік Капітулка не хацеў на сходзе тэкстыльшчыкаў і на мітынгу беспрацоўных у Беластоку дапусьціць рэвалюцыйных рабочых гаварыць аб забастовачнай барацьбе ў Белавескай Пушчы, сьцьвярджаючы, што там ніякай забастоўкі няма. І такая тактыка была ўсіх пэпэсэўскіх правадыроў, якія сьпярша пашырылі чуткі, што забастоўкі ў Белавескай Пушчы няма, і што там панэгул усе беспрацоўныя.

Ініцыятыву арганізацыі бастуючых рабочых узяла на сябе КПЗБ. Пад кіраўніцтвам левай прафсаюзнай ужо на другі тыдзень арганізоўваецца забастовачны камітэт у Новым Гданску. Потым арганізоўваюцца забастовачныя камітэты ў Чэрлянцы і Будах Пусцкіх. На пагадку для стаць далейшае папярэдніе сеткі бастуючых камітэтаў і згуртаваньне іх вакол агульнага забастовачнага камітэту.

З самага пачатку выбуху забастоўкі ведмі важным пытаньнем зьявілася барацьба са штрэйкбрахэрствам. З першых дзён забастоўкі дырэкцыя зьвярнулася да штрэйкбрахэрства. Адразу-ж працэсіона была масовка ў Аджшкаве, адкуль сялянства працавала ў якасьці штрэйкбрахэраў. Пасьля гэтай масоўкі і выступленьня цалага ратуа бастуючых і беспрацоўных з гэтай вёскі ўжо не адзін селянін не пайшоў працаваць штрэйкбрахэрам. Удалося таксама затрымаць у Гайнаўцы сялян з Нароўкі, якіх дырэкцыя завербавала для працы. Карыстаючыся тым, што сялянне ня ведалі пра за бастоўку ў Пушчы, дырэкцыя апляціла ім дарогу і пазбягала, што калі праца ім не спадабаецца, дык яны атрымаюць па 10 злотых на дарогу назад. Сялянне згадзіліся на гэтыя ўмовы. Але, калі давіталіся ў Гайнаўцы аб забастоўцы, вярнуліся дамоў.

Дырэкцыя прывезла потым некалькі сотень штрэйкбрахэраў з Віленскага і Колецкага ваяводзтваў. Аднак, бастуючыя рабочыя не дапусьцілі штрэйкбрахэраў да працы. Пад кіраўніцтвам бастуючых камітэтаў на ўсёй Пушчы былі арганізаваны забастовачныя пікеты.

Зразумела, паліцыя апрану-ж узяла пад сваю апаку штрэйкбрахэраў. Усе Пушча была заполнена паліцыяй. У цэлым разе мосц дайшло да вострых сутычак паміж бастуючымі і паліцыяй, якая ахоўвала штрэйкбрахэраў. Атрады паліцыі нападаюць на рабочых. Ужо ў першы тыдзень забастоўкі было арыштавана звыш 100 асоб. Арыштаваных б'юць і катуюць. Адзін з арыштаваных, бастуючы рабочы т. М. Тарасевіч быў на пастаўнку паліцыі ў Сухоплі павешан. Паліцыя і ласьнікі страляюць на забастовачных пікетах. Акупанты пачалі правозіць у Белавескай Пушчы крыважую «пацыфікацыю» над бастуючымі рабочымі на ўзор «пацыфікацыі» сялянскіх мас на Вальні і Палесьсі. Карныя атрады катуюць рабочых і сялян з вакольных вёсак, якія дапамагаюць бастуючым.

Новае ганебнае злачынства фашыстаў—забойства т. Тарасевіча і масавыя арышты выклікалі вялікае абурэньне сярод працоўных мас. На сходах і мітынгах бастуючыя ўхваляюць рэзалюцыі пратэсту супроць забойства т. Тарасевіча, патрабуюць безадкладнага выдаленьня з лесу штрэйкбрахэраў і вываду выкліканай паліцыі. Забастоўка прымае ўсё больш выразны палітычны характар.

Геройская забастоўка белавескіх рабочых выклікала жывую сымпатыю сярод рабочых і працоўнага сялянства Зах. Беларусі і Польшчы. Дзякуючы КПЗБ пашыраецца асабліва сярод пралетарыяту Беластоку і сялянства вакольных вёсак кампанія салідарнасьці з бастуючымі. Ужо ў першыя дні забастоўкі сялянства вакольных вёсак прывезла сабраную бульбу ў Новы Гданск.

У Гайнаўцы адбыліся два вялікія мітынгі сялян, на якіх пастаноўлена далей збіраць дапамогу для бастуючых і змагацца з штрэйкбрахэрствам. Апрача таго адбыліся цэлы рад іншых большых і меншых масовак, скліканых КПЗБ і прафсаюзнай левіцай у Гайнаўцы, Белавежы. У Беластоку адбылося некалькі сходаў тэкстыльшчыкаў, на якіх быў выбран камітэт салідарнасьці і прыступлена да збору сродкаў. Апрача таго, адбыліся сходы шаўцоў, краўцоў, пекароў, малярoў, на якіх ухвалены рэзалюцыі салідарнасьці з геройскай барацьбой рабочых Белавескай Пушчы і зараз-жа пры ступлена да збору грашовых сродкаў на дапамогу бастуючым. Рабочыя металёўцы, цырульнікі, будаўнікі і шофэры, таксама пачалі збіраць сродкі для бастуючых. Беластоцкія рабочыя выслалі ў Белавеж да бастуючых сваіх делегатаў. Делегаты перадалі дапамогу і расказалі бастуючым аб забастовачнай практыцы тэкстыльшчыкаў і шаўцоў Беластоку, аб здрадніцкай ролі сацыял-фашыстаў у часе гэтых забастовак.

Забастоўка, якая пад націскам рабочых была абвешчана пэпэсэўскім прафсаюзам, па меры свайго разьвіцця пачала перарастаць пад уплыў прафсаюзнай левай і камуністычнай партыі. Не дапускала ПНС пасьпяховая зьмена першапачатковай тактыкі. Цэнтральны орган ПНС.—«Роботнік», які спачатку маўчаў, як вады ў рот набраўшы, аб забастоўцы, раптоўна пачаў зьнішчаць карэспанцэнцыі аб барацьбе белавескіх рабочых і нават заклікаць да збору дапамогі для бастуючых. Мясцовыя пэпэсэўскія мапашэньні, напрыклад, Пасэка прыймаюцца нагул вельмі радыкальнымі, каб ня страціць уплыву сярод белавескіх рабочых, якія ў жорсткай барацьбе апошняга году знаўна зрэвалюцыянізаваліся.

Агідная і здрадніцкая палітыка пэпэсэўскіх правадыроў выклікала вялізарнае незадаваленьне нават сярод рабочых—членаў гэтай здрадніцкай партыі. Пэпэсэўская рабочым пачынаюць разумець, што «левыя» фразы іх правадыроў служаць адзіна толькі для таго, каб лепш ратаваць свае ўлады і далей выкошваць ролю абаронца буржуазіі. Крычучы, што яны супроць паліцэйска га тэрору і пахоплываючы нават некаторыя лёзунгі камуністычнай партыі, Пасэцкія на сходах бастуючых азначаюць даказ вацюць, што ня трэба ладзіць дэманстрацыі перад буйнымі дырэкцыі, што гэта ашчэ зарана. Адначасова, яны вядуць закулісныя махінацыі з дырэкцыяй і інспэктарам працы, і чакаюць толькі адпаведнага моманту, каб зламаць забастоўку.

Але бастуючыя рабочыя з кожным днём усё мацней ім вераць. Рабочыя бачаць, што толькі кампартыя зьяўляецца іх адзіным правадыром і кіраўніком у барацьбе супроць буржуазіі і фашызму.

Беласток, сьнежань 1932 г.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

РАК І БАРАЦЬБА З ІМ

БССР, як і ўвесь Савецкі саюз, дабіваецца вялізарных посьпехаў на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва, у тым ліку і ў галіне аховы здароўя працоўных. Аб гэтым красамоўна гавораць лічбы зьмяншэньня дзіцячай сьмяротнасьці, зьнікненьня вакорванняў, пасьпяховая барацьба з інфэкцыйнымі хваробамі, стварэньне будаўніцтва лекава-прафілактычнай сеткі.

Толькі адна галіна аховы здароўя—барацьба са злоякаснымі пухлінамі—саркомай і ракам—застаецца амаль забытай.

Лекавыя ўстановы Менску і інш. гарадоў штогнёна наведваюць дзесяткі хворых на рак, якія вымагаюць спэцыяльнай і радыкальнай дапамогі і дастасаваньня спэцыяльных мэтадаў лячэньня. Аднак, дапамога аказваецца толькі ня многім. Рэшта ня мае ніякай лячэньня ў Ленінградзе, Маскве, або ўсім не лячыцца. Асабліва гэта датычыць хворых на рак твару, языка, горла. Між тым, ёсьць магчымасьць дастаўляць гэту работу ва ўмовах БССР.

Менск, як цэнтр, павінен стаць на шлях іншых буйных гарадоў СССР, якія дабіліся ў гэтай галіне ўжо значных посьпехаў, скарыстаць іх вопыт і па-сапраўднаму ўзяцца за арганізацыю барацьбы са злоякаснымі пухлінамі.

Арганізацыя барацьбы са злоякаснымі пухлінамі павінна весьціся па наступным напрамках—на лініі выяўленьня прычын узьнікненьня злоякасных пухлін, радыкальнага і радыяльнага лячэньня хворых, прафілактыкі (ранняя дыягностыка) і сэнітарна-асьветчай работы сярод насельніцтва.

Для гэтай мэты ў Менску неабходна арганізаваць суперэфэкразны цэнт, які і будзе спаўняцца кансультыўным аддзяленьнем названых вышэй. Прадпасылкі для гэтага ёсьць. Асноўнымі мэтадамі лячэньня злоякасных пухлін зьяўляюцца адлучэньне хірургічная апэрацыя і прамяньненая тэрапія (радый, рэнтген). Менск ня ўмае ні вопытных і кампетэнтных хірургаў, ні кашчоўнага радыя—элемент 1 рэгістрацыйскія ўстановы. Аднак гэта гаскіпана распылена. Нэма пазнанасьці і арганізацыйнай увагі.

Органам аховы здароўя БССР неабходна пакончыць з сэматужніцтвам у гэтым пытаньні і па-сапраўднаму ўзяцца за арганізацыю барацьбы са злоякаснымі пухлінамі.

Праф. Рубашоў, д-р Бобрык.

ДАШКОЛЬНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ Ў БССР

Вялізарныя дасягненьні ў сацыялістычным будаўніцтве, пасьпяховае выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады забясьпечыла разгортваньне ў БССР дашкольнай работы.

Сетка дашкольных устаноў, дзіцячых саўгасаў, пляцовак за перыяд з 1929 па 1932 год зрасла больш, чым у 12 раз. У 1929 годзе па БССР налічвалася 494 дашкольных устаноў, у якіх знаходзілася 17.400 дзяцей, а цяпер — 6.000 дашкольных устаноў і 200.000 дзяцей.

Выдаткі на дашкольнае выхаваньне з вялікім гадам павялічваюцца. Так, у 1931 годзе на гэту мэту было адпушчана 1.830 тыс. руб., а ў 1932 г. каля 8,5 млн. руб.

Ашчэ больш шпаркія тэмпы разьвіцця дашкольнай работы намячае Наркамасьветы ў другой пяцігодцы. Ужо ў 1933—34 годзе намячаецца ахапіць усімі відамі дашкольнага выхаваньня 75 проц. дзяцей ва ўзросьце ад 4 да 6 год, а ў 1936—37 годзе — усіх дзяцей, прычым выключна ў стацыянарных установах.

Навіны навукі і тэхнікі

Першы ў сьвеце

Нядаўна пушчан першы цэх Верхня-Салдзінскага заводу Уралтальмосту. Па сваёй вытворчай магутнасьці гэта будзе першы ў сьвеце па вялічыні мостабудаўнічы завод. Завод запраектаваны на выпуск 240 тыс. тон сталёвых канструкцый і мастоў у год.

Керамічныя радыятары

Для апаленьня памяшканьняў у нас ужываюцца радыятары. Ня вырыб іх выдатковаецца па Саюзе да 3 млн. тон чыгуну ў год. Цяпер вопыт замены чыгуну прарабіў Кіеўскі інстытут будматар'ялаў. Новы трохпавярховы будынак гэтага інстытуту абсталёваны керамічнымі радыятарамі. Яны адлітыя на Славуцкім фарфасавым заводзе з глінастай масы.

Эксплёатацыя паказала, што керамічныя радыятары ня толькі могуць замяніць чыгунныя, але і маюць пераваг перад імі. Керамічныя патрабуюць менш аплату для абагрэваньня памяшканьня, больш маруднае астываюць, лягчэй металічных.

Масква і вобласьць у блізкіяшыя гады атрымаюць новыя радыятары. Мабсавет ужо запраектаваў пабудову заводу пратуцкіх радыятараў у год.

СУД

СПРАВА КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЯНЭРАЎ-ШКОДНІКАЎ З БЕЛДЗЯРЖСНАБУ

Сёньня, а 6 гадз. вечара, у памяшканьні клюбу харчавога імя Сталіна пачнецца працэс контр-рэвалюцыянэраў-шкодникаў — былых работнікаў Белдзяржснабу. Справу разглядае асобная прысутнасьць Вярхоўнага суда БССР пад старшынством тав. РЭЙНСКАГА. Члены суда т. т. КАНТАРОВІЧ і КАЗЬЛЯК. Дзяржаўным абвінавачуцай выступае памочнік пракурора рэспублікі тав. ЛІПСКІ. Абаранаюць т. т. МАЛКІН, ГЕРНОВІЧ, АКІМАЎ і ШУЛЬМАН.

Уваход у залю суда па спэцыяльных пропусках, разьмеркаваных па прадпрыемствах і ўстановах праз фабзаўмясцкомы.

Паведамленьні

— Усе таварышы, якія пасылі заявы для паступленьня ў вячэрні КІЖ, падышы зьявіцца на іспыты, якія адбудуцца 7 і 8 студзеня, у 8 гадз. вечара, у памяшканьні 6. камвузу (Університэцкая, 27) 3-ці паверх, пакой 62.

Папраўка

У пастанове СНК і ЦК КП(б)Б «Пра забесьпячэньне поўнага выкананьня плянаў за гатовак мяса, малака і сыру» («Зьвязда», № 3 ад 4 студзеня 1933 г.) укралася памылкі: у 2 пункце, трэці радок трэба чытаць: «увагу раённых партыйных і савецкіх арганізацый», трэці радок 4-га пункту трэба чытаць: «гаспадарча-палітычныя кампаніі...»

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Менскі дашкольны тэхнікум
АБВЯШЧАЕ
НАБОР НА 1-шы КУРС
з адукацыяй 7 груп і на
падрыхтоўчыя курсы з адукацыяй 6 груп.
ПРЫЕМ ЗАЯЎ ДА 20 СТУДЗЕНЯ.
Да заявы неабходна прыкласьці наступныя дакументы: аб адукацыі, аб сал. паходжаньні, аб стане здароўя, засьведчаную анкету. Студэнты забесьпечваюцца інтэрнатам. Стыпэндыяй забесьпечваюцца дыфэрэнцыявана ў залежнасьці ад васьпехаўсьці ў першую чаргу рабочыя, калгасьнікі, сяляне-беднякі і г. д.
Дакументы накіроўваць па адрасе: Менск, Савецкая вул. № 144, Дашкольны тэхнікум.
Дырэкцыя.

Вышэйшая цэнтральная калгасная школа
(м-ка Копысь Аршанскага раёну)
абвяшчае
другі набор слухачоў у школу.
Прыём заяў да 15-га студзеня 1931 г.
Паступаючыя павінны мець накіраваньні ад райвыканкомаў або райкому КП(б)Б.
Правілы прыёму дасланы райзямаддзелам.
Стыпэндыя ў разьмеры 101 руб. інтэрнатам забесьпечваюцца ўсе слухачы.
Дакументы дасылаць па адрасе: м. Копысь, Аршанскага раёну, Вышэйшай калгаснай школе.
Дырэкцыя.

Пры Рагачоўскім пэдтэхнікуме
адкрываюцца
6 месячныя падрыхтоўчыя КУРСЫ ў тэхнікум.
На курсы прымаюцца асобы з ведамі за 5 груп сямігодкі.
Курсанты забесьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй, як і ва ўсіх падтэхнікумах.
Пачатак заняткаў 15 студзеня.
Дырэкцыя.

Цэнтральны камітэт т-ва ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ
(Менск, Першамайская вул. дом № 7)
ШУКАЕ НАСТУПНЫХ ГРАМАДЗЯН, якім належыць з Амэрыкі страхоўка, пэнсія і іншыя віды ўзнагароды
ПАСЬЛЯ ПАМЁРШЫХ ТАМ ІХ СВАЯКОЎ
ШУКАЮЦЦА:
1. Шленская Александра—ўдава Шленскага Вярмея.
2. Сваякі Крупцук (Крусук) Данілы.
3. Лейба Раф—бацька Ісаака Раф.
4. Бацькі Сулівон Джона.
5. Бацькі Касівік, (Косіўцік) Джо (Язэп).
6. Даніла Туровіч-бацька Туровіч Джон Д. (Янка).
7. Тоба Новапруцкая—сястра Ізраіля Новапруцкага.
8. Маці Разновіч Язэпа.
9. Бацькі Копат Тоні (Антося).
10. Ганна Сілінік-Лутаровак—маці Сілінік-Лутаровак Вілільма.
11. Агнэса Зіта—маці Зіта Майка (Мікола або Міхась).
12. Цімох Ігнатавіч Даніловіч—бацька Даніловіча Майка (Мікола або Міхась).
13. Янка і Язэп Жанкоўскія—браты Генкоўскага (Жанкоўскага) Пятра.
14. Абрам і Ганна Рафоўскія-Кац—бацькі Каца Веніяміна.
15. Жонка Мар'я і дзіця Раманчук Васіля.
16. Наста, Тацьяна і Надзея Ромэк (Грамыка)—жонка і дзеці Аляксея Ромэк (Грамыка).
17. Лора Лупкая—маці Луцкага Макса.
18. Бацькі Пасмукскага Ігната.
19. Маці Прыстонка Міхася.
20. Эстэр, Лея, Мойсей і Ганна Трэйнор—маці, брат і сястра Гелерынга Хаймана.
21. Савва Макомед—бацька Макомед Дзяміда.
22. Рахіль Рубін—маці Рубіна Макса.
23. Бацькі Пуркоскага Эдуарда.
24. Жонка Сідора Томаса.
25. Бацькі, брат і сястра Плацека Язэпа Тэадора.
26. Ульяна Кавальчук—жонка Кавальчука Пётры.
27. Сваякі Гасінскага Чарльса (Карла).
28. Капярыма Сардзюк—сястра Сардзюка Абрама.
29. Цыпінава—Басманова Зыгмунда.
30. Гольбэрман Рогля.
31. Хайман і Фаня Фрыдман—бацькі Фрыдмана Чарльза (Карла).
УВАГА: Трэба ведаць, што прозьвішчы з Амэрыкі часта даюцца перакладзенымі пры перакладзе з Ангельскай на расійскую мову.

Памяшканьне польскага дзяржтэатру (Савецкая, 28, тэл. 15-20, 21612)
ЭСТРАДНЫ ТЭАТР „ДАМЗАЦ"
6 студзеня—адкрыцьцё зімовага сэзону
У праграме прымаюць удзел лепшыя артысты эстрады В. І. Галін, П. Я. Курэнэр, М. К. Нароўная.
Пачатак роўна ў 8 з палов. гадз. вечара. Білеты ў рабкассе з 12 да 2 і з 4 да 5 гадз. веч. і ў касе тэатру з 5 да 10 гадз. вечара.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Каса—ад 1 г. дня. Замежны мастацкі фільм ЖАНЧЫНА ГОРНЫХ УЗВЫШШАЎ Гукавы самарэжысёрскі № 14

ПРАЛЕТАРЫ Мастацкі фільм МІРАБО Дзеяньне дзіцячае сэансы Прыгоды арышкі

СПАРТАК КАСА—ад 1 гадз. дня. Мастацкі фільм АДНА СУПРОЦЬ МНОГІХ Кіно-п'еса ў 8 частках.

РЭДАКЦЫІ „ЗЬВЯЗДА"
ПАТРЭБЕН
ВОПЫТНЫ КАРЭКТАР
ЗВАРА ЧАЦЦА: Савецкая, 63, 3-ці паверх, сакратарыят.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
7 і 8 студзеня
ВЕЧАРЫ СЬПЕВАЎ НАРОДАЎ
А. І. ЗАГОРСКАЙ
ПЕСЬНІ НАРОДАЎ С. С. С. Р.: Расійскія, Украінскія, Беларускія, Азэрбайджанскія, Армянскія, Бурацкія, Башкірскія, Грузінскія, Яўрэйскія, Кіргізскія, Асэтынскія, Татарскія, Туркменскія і інш.
ПЕСЬНІ НАРОДАЎ ЗАХОДНЯЙ ЭЎРОПЫ: Ангельскія, Шатландзкія, Нямецкія, Цірольскія, Багемскія, Італьянскія, Гішпанскія, Баўгарскія, Румынскія, Сэндзімірскія, Польскія, Японскія, Турэцкія, Пэрсыдзкія і інш.
Прафэсар Маскоўскай консэрваторыі В. А. Барысоўскі (Viola d'a mour) М. С. Нямезава-Лунд (РЯЛЬ).
Білеты штодзённа ў касе тэатру ва ўстаноўлен. час і ў рабочай касе з 12—2 і ад 4—6 г. веч.
Пачатак роўна ў 9 г. веч.

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ АД 5 СТУДЗЕНЯ
Нямецкі мастацкі фільм
ГОРНАЯ БАЛЯДА
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:
ТАНЦОРКА—ЛЕНІ РЫФЭНШТАЛЬ
АРТЫСТЫ—Л. ТРЭНКЕРЫ, Э. ПЭТЭРСОН.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ КІНО-ХРОНІКА САЮЗКІНО
КАСА АДКРЫТА АД 12 ГАДЗ. ДНЯ.

Выдавецтва ЦК КП(б)Б „Зьвязда"
АДКРЫТА ПАДПІСКА на 1933 год
НА ПАПУЛЯРНУЮ МАСАВУЮ ЧАСОПІСЬ
„Работніца і калгасьніца Беларусі"
выданьне ЦК КПСБ.
Часопісь з 1-га студзеня 1933 году будзе выходзіць 6 РАЗОЎ Ў МЕСЯЦ.
Умовы падпіскі:
на год —3 руб. 60 кап. | на 3 мес.— 90 кап.
на 6 мес.—1 руб. 80 кап. | на 1 мес.— 30 кап.
Падпіску адзначайце пошце, лістаносцам і ўпаўнаважаным па распаўсюджваньні друку на прадпрыемствах і установах.

ПАРТРЭТ мастацк. павялічэньне РАЗЬМ. (без паспарту) 24Х30 см.—22 р. с пересылкай. ХУДОЖ. МАСТ. Г.А.Г. МОСКВА 2, почт. ящ. 446 11.

У аддзел аб'яў званіце па тэлефону 7-81

Менск, друкарня «Зьвязды». Галоўлітбел № 337.